ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАСТАЎНІЦКАЯ газета

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

№ 143 (5325)
Чацвер, 13 снежня 2001 года
Кошт у розніцу — 84 руб.

На нядаўнім пасяджэнні калегіі Міністэрства адукацыі былі ўхвалены асноўныя палажэнні праекта Закона Рэспублікі Беларусь "Аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі" і Падпраграма "Тэхнічнае пераўзбраенне прафесійна-тэхнічнай адукацыі на 2001–2005 гады". За падрабязнасцямі гэтай значнай падзеі наш карэспандэнт звярнуўся да начальніка ўпраўлення прафесійна-тэхнічнай адукацыі Міністэрства адукацыі Э.М.Ганчара.

Эдуард Ганчар, начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь:

"Праблемы прафтэхшколы трэба вырашаць адначасова з праблемамі вытворчасці"

- Эдуард Мікалаевіч, як вядома, у параўнанні з іншымі ўзроўнямі адукацыі прафесійна-тэхнічная сістэма рэспублікі ў значнай меры залежыць ад рэфармавання эканомікі і тэхналагічных змяненняў вытворчасці. Імклівасць гэтых пераўтварэнняў непазбежна нараджае праблемы прававога і эканамічнага характару, якія патрабуюць заканадаўчага рэгулявання. Менавіта такім дакументам у бліжэйшай перспектыве стане Закон "Аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі".

– Сапраўды, распрацоўка праекта гэтага Закона з'яўляецца важным крокам у развіцці прафесійна-тэхнічнай адукацыі рэспублікі.

На працягу апошняга дзесятка гадоў наша прафтэхшкола дзейнічае ў новых сацыяльна-эканамічных умовах. Пры гэтым яна па-ранейшаму захоўвае лепшыя традыцыі падрыхтоўкі рабочых кадраў. Яе выпускнікі, дарэчы, складаюць амаль дзве трэці працоўнага патэнцыялу і чверць насельніцтва рэспублікі.

Але, разам з тым, дасягнуты ўзровень развіцця ПТА ўжо не адпавядае патрабаванням дзяржавы і грамадства. Прафтэхшкола, на жаль, не заўсёды своечасова рэагуе на перамены ў эканоміцы, сацыяльнай сферы і на рынку працы, што не дае магчымасці забяспечваць патрэбы работадаўцаў належным чынам. Таму на сённяшнім этапе развіцця наша прафтэхшкола павінна цесна ўзаемадзейнічаць з прадстаўнікамі розных сектараў эканомікі, бо ад змяненняў у кваліфікацыйных патрабаваннях залежыць змест прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Такія ўзаемаадносіны магчымыя толькі пры адпаведнай прававой базе, якая створыць аснову для развіцця айчыннай прафтэхсістэмы з улікам патрэб часу.

Праект Закона аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі распрацаваны Рэспубліканскім інстытутам прафесійнай адукацыі сумесна з упраўленнем прафтэхадукацыі Міністэрства адукацыі . Ён разгледжаны структурнымі падраздзяленнямі міністэрства, рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, галінамі, для якіх праведзена падрыхтоўка кадраў, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам. Адметна, што экспертыза праекта Закона была праведзена членамі часовай рабочай групы, куды ўвайшлі прадстаўнікі Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, а таксама Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства фінансаў, некаторых галіновых міністэрстваў. Праект Закона абмеркаваны і ўхвалены на пасяджэнні Рэспубліканскага Савета дырэктараў прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў.

Хочацца адзначыць, што ў праекце Закона прапанаваны нормы, якія ўдакладняюць дзеючае заканадаўства ў сферы адукацыі, замацоўваюць палажэнне і тэндэнцыі ў сістэме прафтэхадукацыі, прадугледжваюць укараненне новых падыходаў у рэгуляванні адносін ПТА з сацыяльна-эканамічным комплексам.

У дакуменце канкрэтызаваны нормы, якія дазваляюць рэалізаваць права грамадзян на атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі, а таксама нормы, якія забяспечваюць стварэнне неабходных для гэтага ўмоў.

Так, адна з нормаў праекта замацоўвае канстытуцыйнае права грамадзян на даступнасць прафтэхадукацыі. Іншыя нормы прадугледжваюць магчымасць атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў розных установах адукацыі і арганізацыях; па розных формах навучання, у тым ліку і ў скарочаных тэрміны. Уведзена норма прыярытэтнасці прафтэхадукацыі ў галіне навучання рабочых кадраў.

Некаторыя нормы замацоўваюць змяненні, звязаныя са шматфункцыянальнасцю навучальных устаноў, увядзеннем стандартаў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, пераліку вучэбных спецыяльнасцей, разнастайных адукацыйных праграм, вучэбна-праграмнай дакументацыі новага пакалення.

Што тычыцца рэгулявання ўзаемаадносін з сацыяльна-эканамічным комплексам, то ў праекце Закона прадугледжаны прававыя нормы, якія павышаюць ролю індывідуальных дагавораў: навучэнец-арганізацыя-навучальная ўстанова. Адзначу, што дагаворная сістэма падрыхтоўкі рабочых кадраў, якая існуе на сёння, неэфектыўная. Таму адна з нормаў праекта не толькі вырашае праблему прыёму навучэнцаў па дамоўленасцях з арганізацыямі, а і праблему адпрацоўкі выпускніком адпаведнага тэрміну ў гэтай арганізацыі. Гэта, безумоўна, павысіць адраснасць падрыхтоўкі кадраў і вырашыць праблему замацавання выпускнікоў.

Вялікае значэнне маюць і тыя выкладзеныя ў праекце нормы, якія прадугледжваюць удзел заказчыкаў кадраў, органаў кіравання, грамадскіх арганізацый, галін сацыяльна-эканамічнага комплексу ў працэсе развіцця ПТА.

Такое цеснае супрацоўніцтва прафтэхадукацыі з прадстаўнікамі вытворчасці неабходна пры выпрацоўцы дзяржаўнай палітыкі, устанаўленні адукацыйных стандартаў, вучэбных спецыяльнасцей, вызначэнні заказу на падрыхтоўку рабочых, арганізацыі вытворчага навучання, выпускных кваліфікацыйных экзаменаў, а таксама пры ацэнцы эфектыўнасці і якасці прафесійнага навучання.

Хацелася б засяродзіць увагу і на пытанні фінансавай і матэрыяльнай падтрымкі развіцця прафтэхадукацыі.

Пры істотным зніжэнні бюджэтных расходаў на яе развіццё важнейшай задачай з'яўляецца ўстанаўленне такіх нормаў, якія б садзейнічалі прыцягненню інвестыцый у рамках шматканальнага фінансавання, у тым ліку далучэнне вытворчай сферы краіны да ўдзелу ў фінансаванні ПТА і развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы ПТНУ.

Калі гаварыць увогуле, дык для вырашэння сённяшніх праблем прафтэхадукацыі трэба ўдасканальваць прававыя механізмы і нормы, якія б не толькі развівалі прафесійнае навучанне кадраў, а і садзейнічалі задавальненню патрэбы ў іх арганізацый. Відавочна, што праблемы прафтэхшколы трэба вырашаць адначасова з праблемамі вытворчасці.

Хачу адзначыць, што прыняцце Закона "Аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі" будзе спрыяць вырашэнню адзначаных праблем. Ён стане надзейным інструментам правядзення адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Закон будзе мець сацыяльна асобасную накіраванасць і будзе абараняць правы і інтарэсы кожнага грамадзяніна.

- У нашай рэспубліцы па-ранейшаму захоўваецца нізкі ўзровень матэрыяльна-тэхнічнай абсталяванасці навучальных устаноў прафтэхадукацыі, што негатыўна адбіваецца на якасці прафесійнай падрыхтоўкі навучэнцаў. Якія шляхі вырашэння гэтай праблемы прапаноўвае Падпраграма "Тэхнічнае пераўзбраенне прафесійна-тэхнічнай адукацыі"?

– Хачу пачаць з таго, што ў апошнія гады ўпраўленнямі адукацыі аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, прафтэхустановамі прыняты захады па ўдасканаленні вучэбна-матэрыяльнай базы ПТНУ. Так, 47,7 працэнта ўстаноў абсталяваны сучаснымі ІВМ-камп'ютэрамі. У 2000–2001 годзе за кошт розных крыніц фінансавання для ПТНУ сельскагаспадарчай вытворчасці набыта 29 трактароў МТЗ-1221, 36 адзінак іншай навейшай тэхнікі. Рашэннямі Гродзенскага і Магілёўскага аблвыканкамаў вытворчыя прадпрыемствы былі замацаваны для сумеснай дзейнасці і развіцця вучэбна-матэрыяльнай базы за кожнай прафесійна-тэхнічнай установай. Характэрна і тое, што ў большасці навучальных устаноў, акрамя ПТНУ сельскагаспадарчага профілю, вытворчае навучанне арганізавана на базе прадпрыемстваў – заказчыкаў кадраў – з выкарыстаннем таго абсталявання, якое выкарыстоўваецца на вытворчасці. Удзельная вага вытворчага навучання, арганізаванага на базе прадпрыемстваў, складае сёння 20–30 працэнтаў, а па прафесіях будаўніцтва, гандлю, перапрацоўкі, лёгкай і тэкстыльнай вытворчасці, лясной гаспадаркі і таго больш – да 70–100 працэнтаў.

Але ж пры ўсім гэтым у краіне захоўваецца нізкі ўзровень тэхнічнага забеспячэння як навучальных устаноў, так і арганізацый-вытворцаў. А калі ўлічыць, што 40–50 працэнтаў вучэбнага часу адводзіцца на практычнае навучанне і трэба забяспечыць высокую кваліфікацыю рабочых, заставацца ў баку ад наспелых праблем ужо немагчыма.

Таму ў адпаведнасці з Праграмай развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі Рэспубліканскім інстытутам прафесійнай адукацыі і ўпраўленнем прафесійна-тэхнічнай адукацыі Міністэрства адукацыі быў распрацаваны праект Падпраграмы тэхнічнага пераўзбраення сістэмы ПТА на бліжэйшыя пяць гадоў, які адкрывае новыя падыходы ў вырашэнні гэтага пытання.

Бясспрэчна, асноўнай праблемай ажыццяўлення тэхнічнага пераўзбраення з'яўляецца абмежаванасць бюджэтнага фінансавання. Значна скарацілася закупка і бязвыплатная перадача прадпрыемствамі абсталявання для ПТНУ. Выпадкі пастаўкі новай тэхнікі сталі адзінкавымі. Такая значная раней крыніца, як цэнтралізаваныя рэсурсы міністэрстваў, сёння практычна адсутнічае. Таму, на наш погляд, вырашэнне гэтай праблемы магчыма за кошт акумулявання рэсурсаў пад асобныя напрамкі з пераводам значнай часткі вытворчага навучання ва ўмовы вытворчасці.

Гэта азначае, што асноўны акцэнт Падпраграмы зроблены на ўмацаванне непасрэдных сувязей з арганізацыямі-заказчыкамі кадраў, якія будуць несці асноўны цяжар тэхнічнага пераўзбраення прафтэхадукацыі і прымуць удзел у арганізацыі прафесійнай падрыхтоўкі. Таму асноўныя нашы намаганні павінны быць накіраваны на ўдасканаленне і пашырэнне вытворчага навучання на базе прадпрыемстваў-заказчыкаў кадраў.

У Падпраграме прадугледжаны меры па забяспячэнні саміх навучальных устаноў новай тэхнікай і абсталяваннем. Для гэтага на ўзроўні аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама ўзгоднены мінімальная колькасць машын і абсталявання, а таксама крыніцы фінансавання для іх набыцця. На жаль, гэта тая іх мінімальная колькасць, якую рэальна можна было запланаваць. Яна складае толькі пяць працэнтаў ад патрэбнай, калі арыентавацца на правядзенне вытворчага навучання пераважна на базе навучальных устаноў.

Гэтыя рэсурсы можна накіраваць як на абсталяванне навучальных устаноў, так і на стварэнне цэнтраў вытворчага навучання, дзе будзе сканцэнтравана навейшае тэхнічнае забеспячэнне для навучальных устаноў рэгіёна. У далейшым можна планаваць пашырэнне сеткі цэнтраў вытворчага навучання, распрацоўку, вытворчасць альбо закупку імітацыйных сродкаў вытворчага навучання – трэнажораў, аўдыёвізуальных і мультымедыйных тэхнічных сродкаў.

Хачу дадаць, што прадстаўлены праект Падпраграмы – гэта перш за ўсё арганізацыйна-кіраўніцкі дакумент, дзе прадугледжаны і неабходныя рэсурсы. Ён узгоднены з усімі аблвыканкамамі, Мінскім гарвыканкамам, зацікаўленымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, Міністэрствам фінансаў і Міністэрствам юстыцыі.

Праблема тэхнічнага пераўзбраення прафтэхустаноў мае шматпланавы, міжгаліновы характар і можа быць вырашана з удзелам органаў дзяржаўнага кіравання ўсіх узроўняў і арганізацый.

Рэалізацыя гэтай Падпраграмы будзе яшчэ больш эфектыўнай, калі створыцца адпаведная нарматыўна-прававая база: будуць прыняты Закон "Аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі", палажэнні аб вытворчым навучанні, аб цэнтры вытворчага навучання.

Ужо завяршаецца работа над праектамі гэтых нарматыўна-прававых актаў.

Гутарыла Ала КЛЮЙКО.



З кардону і паперы стварыў уяўны горад летуценнік з 11 класа Дзягавіцкай сярэдняй школы Крычаўскага раёна Артур Касаткін (на здымку). І трапіў са сваім тварэннем прама на раённы конкурс, абвешчаны райкамам БПСМ, дзе атрымаў першы ў жыцці прыз.

Фота Валерыя БЫСАВА, БЕЛТА.

Кнігі па заяўках настаўнікаў

Рэдакцыя часопіса "Пачатковая школа" пашырае сваю выдавецкую дзейнасць. У аддзяленнях сувязі пачалася падпіска на метадычныя дапаможнікі з серыі "Бібліятэка "Пачатковай школы". Тэматыка будучых выданняў залежыць ад прапаноў настаўнікаў. Магчыма, некаторыя з чытачоў, якія маюць цікавыя распрацоўкі ўрокаў, эфектыўныя методыкі, аўтарскія праграмы, самі стануць аўтарамі новых дапаможнікаў.

Першай кнігай, якая выйдзе ў гэтай серыі, будзе "Буквар: старонка за старонкай" А.Р.Бязручкі. Гэтыя метадычныя распрацоўкі да Буквара А.Клышкі дапамогуць дастаткова поўна рэалізаваць закладзеныя ў падручніку ідэі навучання грамаце.

Метадычны апарат выдання могуць выкарыстаць і настаўнікі, якія працуюць у школах з рускай мовай навучання.

Несумненна, зацікавіць педагогаў-пачаткоўцаў наступная кніга серыі – "Праздник каждый день". Яна прыйдзе да чытачоў у сакавіку 2002 года. У зборніку сабраны сцэнарыі ранішнікаў, пазакласных мерапрыемстваў, тэатралізаваных прадстаўленняў. Вялікі аб'ём сцэнарных матэрыялаў, назапашаны складальнікамі зборніка, дазволіў адабраць найлепшыя распрацоўкі на рускай і беларускай мовах. Яны дапамогуць настаўнікам, выхавальнікам, педагогам-арганізатарам правядзіць яркія, незабыўныя святы ў школе і дзіцячым садзе.

Навіны

Папоўнілі педагагічны багаж

Каля двух гадоў назад у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце быў адкрыты спецфакультэт псіхолага-педагагічнай перападрыхтоўкі выкладчыкаў эканамічных дысцыплін, які быў закліканы даць маладым выкладчыкам спецыяльныя педагагічныя навыкі. І вось першыя дыпламаваныя спецыялісты гэтага факультэта пасля ўручэння адпаведнага дакумента з поўным правам могуць лічыць сябе педагогамі.

Чатырнаццаць выкладчыкаў розных кафедраў БДЭУ абаранілі свае дыпломныя праекты ў залежнасці ад профілю адукацыі, атрымаўшы высокую ацэнку камісіі, якую ўзначальваў начальнік Дзяржаўнай інспекцыі сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь прафесар М.Плескацэвіч. Дыпломныя праекты выпускнікоў спецфакультэта тычыліся пераважна новых педагагічных тэхналогій выкладання, якія аўтары збіраюцца ўвасабляць у жыцці.

Чарговы выпуск групы маладых выкладчыкаў, якія валодаюць неабходнымі педагагічнымі ведамі, адбудзецца ў снежні. А са студзеня спецфакультэт прыме новых слухачоў, у тым ліку і з іншых ВНУ горада. Як паказаў час, новае падраздзяленне БДЭУ здолела даказаць сваю неабходнасць. А тых, хто хацеў бы павысіць сваю кваліфікацыю, – дастаткова. Маладое пакаленне выкладчыкаў ВНУ эканамічнага профілю з энтузіязмам імкнецца папоўніць свой педагагічны багаж і знайсці лепшыя шляхі для ўзаемін са студэнтамі.

Антаніна ПЯТРОВА.

Адкрылася новая гімназія

Першая праваслаўная царкоўная гімназія і духоўна-асветніцкі цэнтр сталі дзейнічаць у Гомелі на базе царквы ў гонар іконы Божай Маці "Усіх смуткуючых Радасць".

Варта нагадаць, падмурак гэтага духоўнага цэнтра быў закладзены яшчэ пры гарадской бібліятэцы № 11, дзе на працягу пяці гадоў плённа дзейнічалі праваслаўныя нядзельныя школы для дзяцей і дарослых, школа міласэрнасці. Менавіта там нарадзілася ідэя стварэння гімназіі пазашкольнага тыпу, збіраўся патрэбны вопыт, набываліся веды.

Сёння гімназію наведваюць каля 60 дзяцей і падлеткаў. Выхаванцы вывучаюць не толькі прадметы духоўна-маральнага плана, але будуць атрымліваць веды і па ваеннай, спартыўна-прыкладной падрыхтоўцы. Асаблівае месца займае патрыятычнае выхаванне будучых абаронцаў Айчыны. Таксама пачнецца гурткоўная работа, дзе хлопчыкі і дзяўчынкі знойдуць цікавы занятак, які паспрыяе ўсебаковаму развіццю кожнай асобы.

Ганна АТРОШЧАНКА.
Гомель.

Знаходкі "першамайцаў"

Асноўны дэвіз працы педагогаў Першамайскага раёна Віцебска - "Рэформу школы - у жыццё". Вось і чарговы конкурс, арганізаваны аддзелам адукацыі і райкамам прафсаюза, прайшоў пад гэтым жа лозунгам.

78 настаўнікаў пачатковых класаў прадставілі 83 распрацоўкі ўрока навучання чытанню па буквары А.Клышкі. Мэта конкурсу – удасканаленне метадычнага забеспячэння новай праграмы ў падрыхтоўчых класах, аказанне канкрэтнай дапамогі педагогам у падрыхтоўцы ўрокаў чытання і пісьма па альтэрнатыўным падручніку.

Экспертная камісія на чале з метадыстам В.Новікавай адзначыла дыпломамі трох ступеняў 43 аўтараў найбольш таленавітых распрацовак. Самую высокую ацэнку за арыгінальнасць урокаў, навізну метадычных падыходаў і зместу, высокі прафесіяналізм атрымалі настаўнікі вышэйшай катэгорыі А.Лазарава (сярэдняя школа № 36) і Л.Філімонава (сярэдняя школа № 33). Кожнаму пераможцу старшыня РК прафсаюза С.Конікава ўручыла памятны падарунак.

Камісія прызнала высокую практычную каштоўнасць прапанаваных на конкурс работ, якія будуць выкарыстаны ў практыцы. Яна абагульніла станоўчыя моманты, якія садзейнічаюць развіццю і падтрыманню цікавасці ў вучняў на ўроках чытання: гэта эфекты навізны, разнастайнасці і выяўленне супярэчнасцей паміж новымі і ранейшымі ведамі; захапляльнасць форм і метадаў выкладання; пошук і самастойнасць у вырашэнні пазнавальных задач; а галоўнае – займальнасць і гульні.

Настаўнікі прапанавалі не толькі мноства разнастайных метадычных гульняў на развіццё ўвагі, памяці, уяўлення пры навучанні чытанню ("Не памыліся", "Літара заблудзілася" і інш.), але і разнастайныя гульневыя формы ўрока ў цэлым (урокі-падарожжы, святы, КВЗ і інш.).

Многія настаўнікі рэспублікі, якія вучаць шасцігодак па буквары А.Клышкі, смела могуць звяртацца за метадычнай дапамогай у Віцебск – у "першамайцаў" багаты арсенал інавацыйных знаходак.

Святлана ЛАВЕЙКІНА.

Помнік Тарасу-палясоўшчыку

У першы дзень зімы ў мястэчку Гарадок Віцебскай вобласці ўсталявалі новы помнік. Падзея сама па сабе - значная (культурнае жыццё раённых цэнтраў не назавеш перанасычаным). Але помнік тым больш адметны, што ўвекавечвае не рэальную асобу, а... літаратурнага персанажа, палясоўшчыка Тараса з паэмы XIX стагоддзя "Тарас на Парнасе".

Упершыню твор быў надрукаваны ў газеце "Минский листок" у 1889 г., неадназарова выходзіў у асобных выданнях, перадаваўся і вусна. Да нядаўняга часу паэма лічылася ананімнай. Адшуканыя сшыткі даследчыка і паэта XIX стагоддзя А.Рыпінскага пацвердзілі думку сучаснага навукоўца Г.Кісялёва, што найбольш верагодны аўтар – Канстанцін Вераніцын. Побач з перапісаным тэкстам значылася прозвішча Вераніцына, а таксама дата і месца напісання твора: 1855, 15 красавіка, Гарадок.

Мемарыял назвалі "першым помнікам роднаму слову" (хаця плошчу Якуба Коласа ў Мінску аздабляюць фігуры Сымона-музыкі і дзеда Талаша з твораў класіка). Гарадоцкая кампазіцыя размешчана ля краязнаўчага музея (у якім у дзень адкрыцця помніка адчынілі дзве новыя залы: этнаграфіі й народных рамёстваў). Помнік уяўляе сабой два валуны. На адным – выбітая мастацкая шыльда з першымі радкамі паэмы і звесткамі пра аўтара. На другім камені (што ў рост чалавека) – барэльеф, разгорнутая кніга, з якой выходзіць сам Тарас (побач відаць і абліччы парнаскіх багоў).

Ініцыятыва стварэння помніка належыць Віцебскаму дзяржаўнаму універсітэту, а найперш ягонаму прарэктару Анатолю Дарафееву (які паходзіць з Гарадка). На адкрыцці прарэктар пераўвасобіўся ў Тараса, чым надзвычай ажывіў свята. Аўтары кампазіцыі – выкладчыкі кафедры выяўленчага мастацтва Віцебскага універсітэта Іван Каладоўскі і Сяргей Сотнікаў. Стварэнню помніка спрыялі гарадоцкі краязнаўчы музей і мясцовая суполка Таварыства беларускай мовы.

На адкрыццё помніка з'ехаліся навукоўцы і літаратары з Віцебска й Мінска: Анатоль Канапелька, Уладзімір Панковіч, Сяргей Панізнік, Язэп Якушкевіч, доктар навук Алег Лойка (ягоны водгук на паэму таксама выбіты на камені), перакладчык паэмы на ўкраінскую мову Валеры Стралко. Зямляк Тараса паэт Уладзімір Скарынкін узгадаў, што ў гады ягонага дзяцінства "Тараса на Парнасе" ведалі напамяць у кожнай беларускай хаце.

Па словах паэта Сяргея Панізніка: "Зямля небезназоўная тады, калі глыбінкі яе напаўняюцца мемарыяльнасцю. Каб нас пазнавалі, варта выклікаць з ананімнасці, "раскручваць" імёны землякоў".

Крысціна ПУЧЫНСКАЯ.

ІНДЭКС

для індывідуальнай падпіскі 63867 | для ведамаснай падпіскі 63363

РП-1

Министерство связи Республики Беларусь

АБОНЕМЕНТ на ~~журнал~~ газету (индекс издания)

Настаўніцкая газета (наименование издания)

Количество комплектов

на 2002 год по месяцам

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Кому (фамилия, инициалы)

Куда (адрес)

(почтовый индекс) (город, населенный пункт)

ДОСТАВОЧНАЯ КАРТОЧКА

на ~~журнал~~ газету (индекс издания)

Настаўніцкая газета (наименование издания)

Стоимость подписки руб. переадресовки руб. Количество комплектов

на 2002 год по месяцам

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Кому (фамилия, инициалы)

Куда (адрес)

(почтовый индекс) (город, населенный пункт)

Ліцэі

Традыцыі новай школы

Тваё жаданне вучыцца залежыць яшчэ і ад таго, у якім доме размешчана твая школа. Не надта спрыяюць навуцы шэрыя, безаблічныя будынкі з казарменнымі калідорамі, цеснымі кабінетамі, у якіх, да таго ж, няўтульна і холадна. Сцены таксама нясуць у сабе інфармацыю - энергетыку, якую закладваюць у іх майстры. На жаль, не кожнае сучаснае памяшканне школы можна назваць храмам навукі...

Усе гэтыя думкі ўзніклі ў мяне падчас наведання Магілёўскага абласнога ліцэя, які месціцца ў будынку, узведзеным у канцы XIX стагоддзя. Прызначаўся ён пад навучальную ўстанову, дзе атрымлівалі адукацыю дзяўчаты, якія прысвяцілі сябе духоўнаму служэнню. З тых часоў ён перажыў многіх жыльцоў, але не перастаў служыць навуцы, не страціў свайго духу. Гэты дух лунае тут паўсюль. І ты ўсведамляеш, які гонар вучыцца ў такім доме, ты перажываеш лёс усіх яго жыльцоў, ты разумееш, што з'яўляешся іх нашчадкам, і таму павінны працягваць традыцыю. Месца гэтае – сапраўды адметнае, дзе можна вырасціць найсапраўднейшага ліцэіста. А дзеці гэтыя – шчасліўчыкі.

Ідэя арганізацыі падобнай установы – абласнога ліцэя – па-свойму дасканалая. Сельскія школы з вясковымі магчымасцямі не паспяваюць за патрэбамі часу. В.С.Багданаў – празорлівы кіраўнік. 11 гадоў таму ён стварыў Магілёўскі абласны ліцэй, куды сабраў больш здольных дзяцей з вёскі (больш здольных найперш да педагагічнай дзейнасці). Вопыт паказвае, што навуковую і іншую эліту трэба выхоўваць у найлепшых умовах.

Цяпер у Магілёўскай вобласці працуюць яшчэ дзве такія ж навучальныя ўстановы – у Крычаве і Быхаве. Сумесна ім ужо лягчэй дапамагаць сельскім школам узнімаць таленавітую моладзь.

Магілёўскі абласны ліцэй прымае на вучобу 30 працэнтаў дзяцей з вёскі і раённых цэнтраў. Якраз столькі, колькі можа змясціць у сабе інтэрнат установы. Адбор вядзецца праз конкурс, дарэчы, не малы. Сваіх вучняў кіраўніцтва ліцэя шукае сярод удзельнікаў прадметных алімпіяд, якія праводзяцца ў раёнах і вобласці. Але рэкламай сябе ў ліцэі ўжо даўно не займаюцца. Добрая слава – лепш за яе.

Падагогі ліцэя – у вялікім задавальненні ад сваіх выхаванцаў. Яны зазначаюць, што займацца з такімі дзецьмі – проста раскоша. Уваходзіш у клас, бачыш разумныя, дапытлівыя вочы – і цябе ахоплівае жаданне тварыць, рабіць як мага больш. З часам не лічышся. Напэўна, гэта мара любога настаўніка – мець удзячнага, зацікаўленага вучня. Але ж такое трэба яшчэ заслужыць.

Ліцэісты, на самай справе, – незвычайныя вучні. Крыху з хваляваннем уваходзіла я ў працоўны кабінет 9"А" класа. Іх у школе завуць "малышамі". Дзеці займаюцца разам толькі некалькі месяцаў, але ўражанне пры размове з імі складваецца такое, нібыта гэта – сталы калектыў. З'ядналіся яны падчас паходу. У школе ёсць такая традыцыя. Ліцэйскае жыццё ўсіх тых, хто паступіў, пачынаецца з паходу-эстафеты, у які адпраўляецца ўвесь клас абавязкова са сваім выхавальнікам (у ліцэі ёсць пасада вызваленага класнага кіраўніка), настаўнікамі профільных прадметаў і інструктарамі – выпускнікамі ліцэя. Рамантыка вандравання, прыгажосць роднай прыроды, сумесны быт, розныя цікавыя мерапрыемствы, спаборніцтвы робяць за тры дні амаль неверагоднае. У школу дзеці вяртаюцца ўжо знаёмымі паміж сабой людзьмі, яны ўлюбляюцца ў сваіх настаўнікаў, звыкаюцца з новымі патрабаваннямі. Пасля ўжо не спатрэбіцца ніякі адаптацыйны перыяд. Традыцыі – гэта моц. На іх трымаецца многае на зямлі.

У Магілёўскім абласным ліцэі гэта – не адзіная традыцыя. Прыйшліся да-спадобы вучням яшчэ і "капуснікі" – пасвячэнне ў ліцэісты. І клуб ролевых гульняў за тры гады набыў папулярнасць. Падчас падрыхтоўкі да новай гульні жадаючых столькі, што даводзіцца праводзіць конкурсны адбор. У працэсе гульні дзеці прымаюць на сябе такія сацыяльныя ролі, якія ім пакуль не даступныя. Трэба смела паглядзець унутр сябе, прымераць да сябе іншы стыль паводзін, зразумець сябе. Можа, калі-небудзь такія гульні дапамогуць дзецям пазбегнуць пэўных памылак у жыцці. Скарбонка ролевых гульняў увесь час папаўняецца, і зараз іх ужо сталі складаць самі ліцэісты.

Дзевяцікласнікі яшчэ толькі далучаюцца да традыцый ліцэя, аднак адзначаюць, што яны ім вельмі падабаюцца ўжо.

9 "А" – фізічны клас. Для іх настаўнік Барашкаў – не толькі мэтр фізікі, але і любімы чалавек. Многія паступаюць у ліцэй менавіта з-за яго імя. Сакрэт яго настаўніцкага таленту вучні бачаць у ягонай прастаце: даходлівасці тлумачэння матэрыялу, цёплых адносінах. У Барашкава, па словах дзяцей, кожны можа на выдатна ведаць фізіку. Мабыць таму яго фізічныя класы – самыя шматлікія. Валерый Васільевіч Барашкаў – Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь. Асаблівага поспеху яго выхаванцы дамагліся на Міжнароднай алімпіядзе па фізіцы ў гэтым годзе: Аляксандр Ермаліцкі атрымаў "золата", а Сяргей Максімаў – "срэбра".

У Магілёўскі абласны ліцэй ідуць вучыцца не толькі да Барашкава, але і да Людмілы Васільеўны Паповай, таксама Заслужанага настаўніка Рэспублікі Беларусь. З-пад яе крыла вылятаюць у свет новыя паэты і празаікі. За дзесяць гадоў у ліцэі падабраўся моцны творчы калектыў педагогаў. Усе яны заслугоўваюць удзячнасці за сваю працу. Педагогі тут разумеюць, што яны працуюць з лепшымі дзецьмі, якія вызначаюцца яркімі разумовымі здольнасцямі, развітай вобразнасцю, усебаковай цікавасцю. Такія вучні патрабуюць ад сваіх выхавальнікаў-настаўнікаў асаблівай увагі і павагі да сваёй унікальнай асобы. Ім неабходна і свабода. У ліцэі ўсё гэта ўлічваецца, таму створана асаблівая атмасфера супрацоўніцтва і творчасці.

Быць ліцэістам – нялёгка. Па ўзроўню ведаў іх параўноўваюць са студэнтамі ВНУ першых курсаў. Вучэбная нагрузка – вялікая, да 40 гадзін на тыдзень. Вытрымаць такое могуць толькі моцныя. Яны і заслугоўваюць гонару заканчваць школу ў званні ліцэіста.

А на развітанне вучні ўпотайкі прыносяць у "трэці" пакой (кабінет псіхалогіі) свае фотаздымкі (самых розных гадоў, пачынаючы з маленства) – каб памяталі, каб не забыліся. Выпускнікі крышку з рэўнасцю пакідаюць сцены роднага ліцэя. Прыйдуць новыя вучні, і яны палоняць сэрца і ўвагу твайго настаўніка. І ўсё зноў паўторыцца.

***

Такое маё першае ўражанне ад Магілёўскага ліцэя. Здаецца, яно адпавядае рэчаіснасці. Пасля вяртання з камандзіроўкі я атрымала ліст ад Вольгі Шэўчык, вучаніцы менавіта таго, 9 "А" класа, з якім я гутарыла ў ліцэі. Дзяўчына спяшалася падзяліцца сваёй радасцю ад змены навучальнай установы. Яна атрымала новы імпульс, трапіла ў асяроддзе салідарных людзей. Другая школа дала яшчэ адзін шанс, адмовіўшыся ад сваіх звычак, перагледзець сваё стаўленне да вучобы, пачаць усё спачатку.

Вось што дзяўчына напісала:

"Пасля залічэння ў ліцэй я і мае аднакласнікі па-іншаму сталі глядзець на вучобу. У школе мы займаліся дзеля адзнак, бацькоў або таму, каб даказаць астатнім, што ты лепшы. Толькі адзінкі вучыліся дзеля сябе. Навучанне ў ліцэі пабудавана на ўзаемадапамозе. Наш клас – як адна вялікая сям'я. Чаму так? Таму што паходы, розныя мерапрыемствы, ды і ўвогуле некалькі месяцаў узаемін у новым коле людзей, змянілі кожнага з нас, і я лічу, што ў лепшы бок.

Але мы не былі б такімі дружнымі, каб не наш любімы і непаўторны, самы лепшы – наш настаўнік фізікі Валерый Васільевіч Барашкаў. Гэтага незвычайнага чалавека, напэўна, ведае ўся Беларусь. Яго стыль выкладання дапаможа дасканала засвоіць прадмет любому. Валерый Васільевіч размаўляе з намі як з роўнымі, ён паважае і любіць нас па-бацькоўску. На яго ўроках усе заўжды ўважлівыя. Мы паважаем свайго настаўніка.

Увогуле, усе настаўнікі ў ліцэі – добрыя і здольны зразумець кожнага з нас. За месяц я палюбіла ліцэй. Ён стаў маім другім домам, і я не шкадую, што зрабіла такі выбар".

***

На нейкі час удыхнуць атмасферу ліцэйскага жыцця мне дапамагла Надзея Іванаўна Савіч, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце. Дзякую за тую асалоду, якую я атрымала. Тады я зразумела, што школы вызначаюцца не настаўнікамі і не праграмамі, а сваімі традыцыямі.

Святлана КІРСАНАВА.

І сёння дзейнічае створаная восем гадоў назад у пасёлку Камунар Буда-Кашалёўскага раёна студыя бальных танцаў. Мясцовая птушкагадоўчая гаспадарка знаходзіць магчымасць падтрымаць студыйцаў, якія з годнасцю адстойваюць гонар раёна на розных конкурсах. На міжнародным фестывалі бальных і спартыўных танцаў "Ружовы фламінга", што праходзіў у Гомелі, сельскіх танцораў выклікалі на "біс".

НА ЗДЫМКУ: "ветэраны" сельскай студыі бальных танцаў дзесяцікласнікі Алена Разумава і Аляксандр Казлоў.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

Скажу добрае слова

Свойскія дзічкі,

альбо І ў лесе будуць яблыні цвісці

Вольга Пятроўна падышла да люстэрка, правяла пальцам пад вачыма, па шчаках. "Божа мой! Гэта ты, тая дзяўчына, што сорак гадоў таму пачынала ў гэтай школе працаваць?", - здзіўлена вымавіла яна ці то для сябе, ці то для мяне. І цяжка ўздыхнула, быццам скінула з плячэй цяжар усіх гэтых, пражытых у адной мясцовасці, гадоў.

У душы я разумеў яе. І мае сорак ад першага самастойнага ўрока праляцелі, нібы птушкі. І, вядома ж, нашы твары пакрыліся тонкім "павуціннем" – адмецінамі ўзросту. А ў душы я па-добраму зайздрошчу настаўніцы. Яна выхавала, лічы, два пакаленні: бацькоў вучыла, цяпер – іх дзяцей. Апавядае яна мне пра гэта і шчыра ўсміхаецца. Значыць, задаволеная. Шчаслівая.

У Жырмунах Вольга Пятроўна скончыла дзесяцігодку і засталася тут выкладаць біялогію, калі атрымала дыплом біяфака Белдзяржуніверсітэта.

ЯК ГЭТА БЫЛО

Першы гурток "Юны батанік" у Жырмунскай сярэдняй школе ўзнік яшчэ ў 1957 годзе. Тады юныя натуралісты збіралі насенне розных дрэў. Іх стараннем быў закладзены гадавальнік на вучэбна-вопытным участку ля школы. Саджанцы паклалі пачатак школьнаму саду, а таксама дэндрарыю. А ініцыятарам гэтага пачыну былі мясцовыя выкладчыкі біялогіі Дзмітрый Станіслававіч Багусевіч і Зінаіда Іванаўна Усава. Сваю справу як эстафету яны перадалі Вользе Пятроўне Агеенка.

Жырмунскае лясніцтва з даўніх часоў лічылася адным з лепшых на Гродзеншчыне. Працоўны калектыў тут узначальваў Мікалай Сяргеевіч Клубовіч, заўзяты аматар прыроды, выдатны спецыяліст, сябра дзяцей і педагогаў. Пенсіянер Клубовіч і цяпер не пакінуў свайго любімага занятку. Кажа, што без лесу яму, як без паветра, не жыць.

Пад кіраўніцтвам Мікалая Сяргеевіча і Вольгі Пятроўны дарослыя і дзеці на працягу чатырох гадоў (1968-1972) залажылі гадавальнік – ажно на 32 гектары.

БЯРОЗЫ ДЫ СОСНЫ, БЫЦЦАМ РОДНЫЯ СЁСТРЫ

Лясніцтва Жырмунскай адзінаццацігодкі, што на Воранаўшчыне, сёння займае 64 гектары. Юныя аматары прыроды маюць сваю экалагічную сцяжыну. З цягам часу школьнікі сваімі сіламі стварылі два гадавальнікі. У першым з іх размешчаны дэкаратыўныя расліны і сеянцы сасны ды ёлкі.

А ў другім гадавальніку разам з юнымі натуралістамі працуюць вучоныя з розных краін. Яны вырашаюць праблему еўрапейскага маштабу: вырошчваюць вопытным шляхам невысокія ростам сосны, якія павінны, на думку спецыялістаў, упрыгожваць многія еўрапейскія гарады. У асаблівай цане і смала гэтых дрэў.

Спраў у юных лесаводаў заўжды шмат. Летась яны пасадзілі дрэўцы на двухгектарнай плошчы. Такое заданне ў вучняў на кожны год. І яно абавязкова выконваецца. Для сваіх пярнатых сяброў дзеці пабудавалі і размясцілі на лесанасеннай плантацыі 40 шпакоўняў і столькі ж кармушак, ежа ў якіх была на працягу ўсёй зімы.

Юннаты абгарадзілі 10 лясных мурашнікаў, правялі разам з дарослымі ачыстку 2 гектараў лесу, нарыхтавалі 900 кілаграмаў ягад аронії і 22 кілаграмы – айвы японскай. А да ўсяго – 7 кілаграмаў лекавых траў.

Папоўнілі вучні свае веды праз шэраг мерапрыемстваў. Яны арганізавалі выставы букетаў і вырабаў з прыроднага матэрыялу, правялі святы і ранішнікі, прысвечаныя "залатой восені", "Дню зямлі" і інш.

СПРАВА ЎСЯГО ЖЫЦЦЯ

Дасягненняў у юных лесаводаў шмат. Яны вядуць гісторыю свайго лясніцтва. Вось адзін з запісаў у гэтай хроніцы. У 1996 годзе вучаніцы 8 класа Крысціна Юргілевіч і Таццяна Швед прымалі ўдзел у рэспубліканскім злёце "Юны лесавод". Мерапрыемства гэтае праводзілася на базе летніка "Зубраня" і прысвячалася 30-годдзю школьных лясніцтваў. Дзяўчынкі выступалі са сваімі паведамленнямі аб выніках вопытніцкай работы. Таня заняла трэцяе, а яе сяброўка – чацвёртае месца. Яны атрымалі адпаведныя дыпломы ды памятныя падарункі.

І хаця час пайшоў не той, жыве добрая традыцыя. Два гады таму прымалі ўдзел у навукова-практычнай канферэнцыі ў Мінску дзевяцікласнікі з Жырмун – Ганна Бянкевіч і Валерый Мелянцэвіч, які падзяліўся асабістым "вопытам па размнажэнню абляпіхі чаранкамі". А Ганна дакладвала, як юннаты вядуць гатункавыўчэнне бульбы ў сваёй гаспадарцы – на эксперыментальнай базе "Кастрычнік". Дарэчы будзе сказаць, што справа, якую пачаў Валерый у школе, прадоўжыцца для яго на ўсё жыццё. Цяпер ён вучыцца ў Гродзенскім аграрным універсітэце.

Трэба спадзявацца – выхоўваюцца ў школьным гуртку "Экалогія роднага краю", які вядзе Вольга Пятроўна, будучыя біёлагі. Васьмікласнік Саша Сургіневіч апавядаў мне аб тым, як яму цікава было летам у "Зубронку", куды вазіў ён вынікі сваіх даследаванняў аб мурашах. Напрыклад, ён набраўся цярпення, каб падлічыць, колькі ношаў цягнуць гэтыя ўпартыя працаўнікі за гадзіну ў напрамку свайго жылля. Саша сядзеў і пінцэтам акуратненька, каб не пашкодзіць, "абязбройваў" па аднаму мурашу на працягу гадзіны, а затым падлічыў усе ношы. Атрымалася каля тысячы. Па прыкладу сваіх падвопытных ён будуе і сваё жыццё: кожны дзень мае занятак. Яго чакаюць свае мурашнікі ў лесе. Саша займаецца развядзеннем і рассяленнем гэтых цікавых лясных жыхароў.

А ў яго сябра, таксама аднакласніка, даследаванне іншага плана. Алег Турчын праводзіць гатункавыпрабаванне вінаграду. Я неяк заікнуўся перад ім, што мару мець гэтую расліну на сваёй дачы. Алег адразу ж выказаў жаданне асабіста заняцца такой справай: дапаможа пасадзіць і даглядаць вінаград. Які гатунак? Ён ля свайго дома мае іх ужо некалькі. Праўда, каб было прыгожа і па-гаспадарску зроблена, яму дапамагае бацька, былы вучань Вольгі Пятроўны. Сапраўдны аматар раслённага свету.

Восенню, калі я наведаўся ў Жырмунскую школу, заняткі гурткоўцаў былі незвычайнымі. Разам з Вольгай Пятроўнай і дзецьмі мы накіраваліся ў вёску, дзе на сваіх падворках дзеці вядуць доследы. Чаго толькі яны не вырошчваюць! Нават грэцкія арэхі, пальмы, лімоны, акцынды.

А затым мы ўсе пакрочылі лясным сцяжынкамі. Гляджу: Валерый Вараноўскі, Алег Турчын, Саша Сургіневіч, іншыя васьмікласнікі абураюцца. У чым справа? Аказваецца, яны прышчапілі ў лесе дзічкі, каб на іх выраслі свойскія грушы. Шмат такіх дрэўцаў хлопцы "прааперырывалі". А нехта паламаў, пазрываў з некаторых дрэўцаў прышчэпы. Дзеці кажуць, што ад гэтай справы ўсё роўна не адмовяцца. Бо вельмі цікава, напрыклад, калі ў лесе будуць яблыні цвісці. Ля іх спыняцца грыбнікі, ягаднікі, паляўнічыя. З'ядуць яблык і дзякуй скажуць таму чалавеку, хто гэтыя дрэўцы прышчапіў.

Канстанцін СТАНКЕВІЧ.

ПТА: новыя грані развіцця

Запытайце ў Раеўскай

Вышэйшае прафесійнае вучылішча бытавога абслугоўвання насельніцтва лічыцца заканадаўцам моды ў прафтэхаўскім асяроддзі сталіцы. І не толькі таму, што прадстаўляе яно швейную вытворчасць і жыве поруч з сучаснай модай. Вучылішча даўно дыктуе свае правілы і ў развіцці прафесійна-тэхнічнай адукацыі, ва ўдасканаленні навучальна-выхаваўчага працэсу. Яно з'яўляецца цэнтрам апрабацыі навейшых адукацыйных і вытворчых тэхналогій, каардынатарам новых пачынанняў, стымулюючым фактарам развіцця прафтэхадукацыі.

Установе сёння ўжо 56 гадоў. І за гэты адчувальны для гісторыі нашай прафтэхсістэмы перыяд швейная вытворчасць рэспублікі папоўнілася 11 тысячамі высококваліфікаваных рабочых, многія з якіх сталі кіраўнікамі прадпрыемстваў, знакамітымі людзьмі ў мадэльным бізнесе. Вучылішча займае сёння лідзіруючую пазіцыю ў высакаякаснай падрыхтоўцы маладых спецыялістаў. Штогод для іх прадастаўляюць рабочыя месцы ў калектывах больш трыццаці прадпрыемстваў швейнай вытворчасці. Гэта Беларускі цэнтр моды, Белбыттэхпраект, вытворча-камерцыйная фірма "Праграс", фабрыка галаўных убораў "Людміла", Дом мод і шэраг іншых знакамітых фірм Мінска.

Ніхто не абвергне той факт, што ўстанова набыла свой творчы ўзлёт менавіта ў час дырэктарства Тамары Аляксандраўны Раеўскай, якая ўзначальвае ўстанову ўжо больш 25 гадоў.

Тамара Аляксандраўна – апантаны, няўрымслівы кіраўнік. Заслужаны работнік адукацыі, таленавіты арганізатар, яна ўмела згуртавала свой калектыў адзінай мэтай: стварыць спрыяльную абстаноўку для развіцця творчага патэнцыялу як педагогаў, так і навучэнцаў. Менавіта твор-

> Фінансавыя пытанні вырашаюцца ва ўстанове за кошт пазабюджэтнай дзейнасці. Вучылішча наладзіла кантакты са шматлікімі прадпрыемствамі і арганізацыямі на выкананне заказаў. Гэта не толькі шыкоўныя фіранкі, якія ўпрыгожваюць ужо мінскія вокны, а нават і канцэртныя касцюмы для знакамітых артыстаў і ансамбляў.

часць і натхненне заўжды нараджаюць тут поспех.

Пытанні кадравага саставу, абнаўлення вучэбна-вытворчай базы, укаранення новых тэхналогій і мадэляў навучання сталі надзённымі для кожнай прафтэхустановы. Але па-рознаму яны вырашаюцца. Яшчэ ёсць кіраўнікі, якія дагэтуль чакаюць дзяржаўнай падтрымкі, лічачы яе адзінай панацэяй ад усіх праблем. А ў выніку – работа проста спыняецца.

Інжынерна-педагагічны калектыў вучылішча бытавога абслугоўвання насельніцтва абнавіўся апошнім часам на 80 працэнтаў. Прыйшлі маладыя майстры вытворчага навучання і выкладчыкі. Па ўсім відаць, пытанне недаўкамплектавання кадравага саставу стаяла і ў гэтай установе. Але дзякуючы намаганням дырэктара хутка былі знойдзены шляхі яго вырашэння. Асноўная стаўка была зроблена кіраўніком на сваіх жа выпускнікоў. Дапамаглі і дзелавыя адносіны з Віцебскім індустрыяльна-педагагічным каледжам, які рыхтуе работнікаў для прафтэхадукацыі. Чым былі заахвочаны маладыя сілы? Па-першае, стварэннем такой атмасферы, дзе пануе дух творчасці, культуры, этыкі, таварыскасці і вялікай адказнасці за даручаную справу. Развіць гэтыя якасці дапамагаюць маладому папаўненню вопытныя педагогі, школа маладога майстра, спецыяльныя семінары па ўкараненні навейшых адукацыйных і вытворчых тэхналогій, па вывучэнні мадэльнага бізнесу. Шырока практыкуюцца тут стажыроўкі маладых спецыялістаў на буйнейшых прадпрыемствах швейнай вытворчасці, у цэнтры сучаснай моды, курсы павышэння кваліфікацыі.

Адметна тое, што калектыў установы самастойна распрацаваў вучэбна-планавальную дакументацыю новай мадэлі навучання, якая адпавядае другой ступені. Справа ў тым, што прафтэхустанова працуе ў статусе вышэйшага вучылішча ўжо чацвёрты год. І сёлета адбудзецца першы выпуск навучэнцаў па прафесіі мадэльера-канструктара-прадпрымальніка. Структура паэтапнага прафесійнага навучання кадраў у ВПВ бытавога абслугоўвання насельніцтва на аснове агульнай сярэдняй адукацыі ўяўляе сабою трохэтапны працэс навучання, на працягу якога навучэнец атрымлівае ў залежнасці ад здольнасцей спецыяльнасці прафесійнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Такім чынам, групы выхаванцаў установы на першай ступені навучання набываюць кваліфікацыю краўца, закройшчыка, а на другой – мадэльера-канструктара-прадпрымальніка. Характэрна, што для правядзення навучання на другой ступені запрошаны спецыялісты Беларускага цэнтра моды і Акадэміі мастацтваў.

У гэты час калектыў установы працуе па праблеме апрабацыі мадэлі падрыхтоўкі кадраў у адпаведнасці з новымі падыходамі да зместу прафтэхадукацыі. Актыўна апрабіруецца ў вучылішчы камплект вучэбна-праграмнай дакументацыі: кваліфікацыйная характарыстыка, вучэбныя планы і праграмы. Праект эксперыментальнай работы вучылішча прадстаўлены на грант упраўлення адукацыі Мінгарвыканкама.

Безумоўна, стымулюючым фактарам творчых пачынанняў калектыву ўстановы з'яўляецца матэрыяльнае заахвочванне. Але, на жаль, няма ва ўстанове надзейнага базавага прадпрыемства, якое б магло спансіраваць інавацыйныя падыходы калектыву. Шкада, канешне, ды не бяда. Фінансавыя пытанні вырашаюцца ва ўстанове за кошт пазабюджэтнай дзейнасці. Вучылішча наладзіла кантакты са шматлікімі прадпрыемствамі і арганізацыямі на выкананне заказаў. Гэта не толькі шыкоўныя фіранкі, якія ўпрыгожваюць ужо мінскія вокны, а нават і канцэртныя касцюмы для знакамітых артыстаў і ансамбляў. Высокі імідж сваіх вырабаў, якія вызначаюцца вытанчанасцю ліній, свежасцю творчай думкі, адметным густам і якасцю, навучэнцы і іх педагогі набылі на паказах і конкурсах Высокай моды, на многіх выставах і фестывалях. А вось сённяшнюю швейную вытворчасць ужо не задаволяць толькі "залатыя рукі". Вытворчыя тэхналогіі сучаснага накірунку патрабуюць і навейшага абсталявання. А каб якасць прадукцыі адпавядала патрэбам спажыўцоў, неабходна і адпаведная матэрыяльна-тэхнічная база.

У вучылішчы налічваецца сёння больш за 500 адзінак новага абсталявання, набытага ў значнай меры і за пазабюджэтныя сродкі. Прыцягваюць увагу сточвальныя, вільготна-цеплавыя, спецыяльныя машыны і аверлокі. У вучэбным кабінеце "Прыкладная інфарматыка" ўстаноўлены камп'ютэры класа "Pentium" і праведзена лакальная сетка.

Камп'ютэры сталі і крыніцай апошняй інфармацыі ў свеце моды. Яны захоўваюць даныя аб развіцці швейнай вытворчасці рэспублікі і іншых краін, каталог мадэльных вырабаў, звесткі аб вядомых куцюр'е, распрацоўкі новых тэхналагічных прыёмаў і вытворчых працэсаў. Да паслуг калектыву педагогаў і навучэнцаў – бібліятэка вучылішча, кніжны і часопісны фонд якой стракаціць навінкамі моды.

Прываблівае ўвагу і унікальны музей гістарычнага касцюма. Калекцыя яго перавысіла 50 экспанатаў, кожны з якіх з'яўляецца непаўторным шэдэўрам швейнага мастацтва. Пазайздросціў бы прадстаўленым уборам нават самы прадузяты сучаснік той далёкай эпохі. А залатая вышыўка на чырвоным аксаміце з празрыстым вэлюмам задаволіла б самую капрызную модніцу таго часу.

Але і сучасным модніцам патрэбны элегантнасць, вытанчанасць формаў і фасону, акуратнасць строчкі. Але колькі трэба папрацаваць, каб стварыць па-сапраўднаму бездакорны выраб!

У працэсе навучання будучых куцюр'е набывае вялікае значэнне ўкараненне новых адукацыйных і вытворчых тэхналогій, пашырэнне дыдактычнай базы вытворчага навучання і ўвогуле камфортная атмасфера творчасці, з чым давялося пазнаёміцца на прадстаўленай панараме адкрытых урокаў.

Юлія Уладзіміраўна Гнедчык, выпускніца ўстановы, толькі два гады працуе ў вучылішчы, але набыла ўжо пэўны вопыт. Яна не толькі ўмелы майстар сваёй справы, але і чуллівы чалавек. Трэба было бачыць, з якой любоўю і павагай звярталася яна да сваіх выхаванцаў, будучых закройшчыкаў і краўцоў. Яны адказвалі ёй тым жа. Тэма ўрока мадэліравання і мастацкага афармлення жакета была прадстаўлена ўсебакова. Былі выкарастаны шматлікія сродкі навучання – эскізы, макеты, узоры-эталоны, картачкі кантролю. Прыйшлі на ўрок нават... манекены. У іх ролі выступілі навучэнкі, якія прадстаўлялі жакеты розных фасонаў.

На ўроку былі выкарыстаны сувязі з прадметамі "Канструяванне швейных вырабаў" і "Матэрыялазнаўства".

Педагагічным крэда Святланы Рышардаўны Яраш ынскай стала яе жыццёвая выснова: вучыць – значыць любіць. Даверлівыя адносіны з навучэнцамі з'яўляюцца асновай кожнага яе ўрока. На гэты раз у групе другакурснікаў па прафесіі "Краўец" Святлана Рышардаўна тлумачыла сваім выхаванцам, як зрабіць апрацоўку ніза рукава прышыўной манжэтай. Шырока выкарыстоўвала майстар вытворчага навучання ўзор гатовага вырабу, алгарытм апрацоўкі ніза рукава манжэтай, карткі задання і кантролю. Была засяроджана ўвага Яраш ынскай на самастойнай рабоце навучэнцаў і карэкцыі іх дзейнасці.

Святлана Рышардаўна ўмела прымяняла ў працэсе навучання рэпрадуктыўны, тлумачальна-ілюстрацыйны, часткова-пошукавы метады, якія дазволілі наладзіць цесны кантакт з выхаванцамі.

Як і С.Р.Яраш ынская, толькі тры гады працуе ў вучылішчы Кацярына Аляксандраўна Рахімава. Мэтай сваёй дзейнасці яна лічыць стварэнне такіх камфортных адносін паміж педагогам і навучэнцам, якія б спрыялі прафесійнаму майстэрству абодвух. У групе першакурснікаў яна паступова закладвала першапачатковыя навыкі і ўменні ў працэсе апрацоўкі бакавой прарэзнай кішэні ў рамку, прывівала акуратнасць у рабоце. Комплексна-метадычнае аснашчэнне ўрока было вельмі насычаным. Ужываліся інструкцыйна-тэхналагічная карта, схема кішэні, алгарытм, карткі кантролю і заданняў. Адразу адчувалася, што навучэнцам прыйшоўся даспадобы прадстаўлены ўрок.

"Я не люблю пустых вачэй", – напісала ў сваёй творчай візітоўцы майстар вытворчага навучання з 20-гадовым стажам Зінаіда Мікалаеўна Янкоўская. Выхоўваць любоў да прафесіі, імкнуцца творча мысліць – педагагічнае крэда майстра. Яна навучае прафесіі вязальшчыцы і з душою ставіцца да сваёй справы. Зінаіда Мікалаеўна ўмее даходліва растлумачыць любое пытанне, паказаць наглядна ўзор, прафесійна спраўляецца яна і са складаным абсталяваннем. Тэма ўрока афармлення ніза вырабу ажурным перапляценнем была засвоена выхаванцам Зінаіды Мікалаеўны з лёгкасцю.

Ва ўменні педагогаў вучылішча перадаваць сваё багатае майстэрства выхаванцам можна было пераканацца на дэманстрацыі мадэляў. На вернісаж маладзёжнай моды былі прадстаўлены калекцыі мадэляў навучэнцаў і іх майстроў. Рамантычныя і ўзнёслыя назвы адпавядалі іх фасонам і колерам. Здавалася, фантазіі і творчаму палёту няма межаў.

> У стылі, якога патрабуе сённяшні дзень, працуе Вышэйшае прафесійнае вучылішча бытавога абслугоўвання насельніцтва. Гэты стыль – дзелавы, патрабавальны, сучасны, не церпіць абыякавасці і ляноты.

Вось яны, знакамітыя "Пецярбургскія тайны", якія перамагалі на многіх конкурсах моды. Нават сама зіма паспяшалася да іх на сустрэчу і насыпала з гэтай нагоды гурбы снегу. А снег стаў, як ніколі, дарэчы. "Пецярбургскія тайны" – гэта калекцыя зімовых паліто, выкананых у стылі XIX стагоддзя.

А ў стылі, якога патрабуе сённяшні дзень, працуе Вышэйшае прафесійнае вучылішча бытавога абслугоўвання насельніцтва. Гэты стыль – дзелавы, патрабавальны, сучасны, не церпіць абыякавасці і ляноты. Магчыма, работа калектыву гэтага вучылішча стане стымулам і для многіх прафтэхустаноў сталіцы. Тамара Аляксандраўна Раеўская падзеліцца вопытам з кожным.

Ала КЛЮЙКО.

Увага: конкурс!

Прыз — каляровы тэлевізар

Рэдакцыя "Настаўніцкай газеты" аб'яўляе конкурс для сваіх індывідуальных падпісчыкаў.

Умовы конкурсу:

1. Удзельніку конкурсу неабходна даслаць у рэдакцыю пісьмо, у якім назваць магчымы падпісны тыраж на "Настаўніцкую газету" на 1 студзеня 2002 года. Тыраж называецца прапіснымі лічбамі.

2. У пісьме ўказваецца хатні адрас удзельніка, нумар хатняга або службовага тэлефона (калі ён ёсць).

Да пісьма прыкладаецца копія падпіснога абанемента (ксеракопія або напісаная ад рукі).

3. Пераможцам конкурсу стане той удзельнік, які дакладна назаве лічбу тыражу. У выпадку, калі дакладная лічба не будзе названа, пераможцам становіцца той, хто назаве лічбу, найбольш прыбліжаную да рэальнай. Калі ж прэтэндэнтаў будзе некалькі, то пераможцу вызначыць жараб'ёўка, праведзеная журы конкурсу.

4. Пры атрыманні прыза пераможцу неабходна прад'явіць рэдакцыі арыгінал падпіснога абанемента.

5. Удзельнічаць у конкурсе маюць права чытачы, якія афармілі падпіску на "Настаўніцкую газету" не менш чым на тры месяцы ў першым паўгоддзі 2002 года.

6. Пісьмы аб удзеле ў конкурсе прымаюцца па пошце або непасрэдна рэдакцыяй не пазней 21 снежня 2001 года па адрасе: 220034, Мінск, вул. Захарава, 42, рэдакцыя "Настаўніцкай газеты" з паметкай "На конкурс".

7. Пераможцу ўстанаўліваецца прыз - каляровы тэлевізар з экранам па дыяганалі - 54 см.

8. Вынікі конкурсу падводзяцца журы не пазней 20 студзеня 2002 года.

Для прыкладу: падпісны тыраж "Настаўніцкай газеты" на IV квартал 2001 г. склаў 27.212 экзэмпляраў.

Даведкі па тэл.: 236-40-63, 236-53-22, 236-91-42.

"Дзеці Беларусі"

У радзільным доме Бабруйска ўстаноўлена унікальнае абсталяванне для рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі неданошаных дзяцей - яно садзейнічае выходжванню немаўлят, якія нарадзіліся вагой ад 500 да 1000 грамаў.

У рамках праграмы "Дзеці Беларусі" абсталяванне набывалася Фондам прэзідэнцкіх праграм. Прыборы для электразабеспячэння, падтрымання тэмпературнага рэжыму, кантролю функцый і складу дыхання, правядзення рознай тэрапіі і дыягностыкі - усё гэтае абсталяванне аб'яднана ў адзін тэхналагічны комплекс. Цяпер, напрыклад, узровень білірубіну ў крыві дзіцяці можна памераць праз скуру.

Такі ж праект будзе рэалізаваны ў радзільных дамах Мазыра і першай Мінскай гарадской клінічнай бальніцы. З удзелам спецыялістаў Расійскай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі медыцынскі персанал пройдзе шматступеннае навучанне.

Пётр ШУБЯНОК.

"Спакой Айчыны да скону дзён буду сцерагчы"

Леў Сапега (1557 - 1633)

Ён атрымаў шмат, ён і аддаў шмат. Лёс выбраў яго, і ён абраў гэты лёс. Ён лічыў, што "павінен дбаць пра грамадскае дабро і пра справы дзяржаўныя". Лёс даў яму ўладу, улада даверыла яму лёс Айчыны, і Айчына стала яго лёсам.

Ён ішоў наперадзе свайго часу і хацеў весці за сабой грамадства. А грамадства азіралася назад, у прызвычаены і знаёмы ўчарашні дзень. Грамадства не разумела яго, бо шукала пажытак у сённяшнім дні.

Жыццёвым дэвізам для Льва Сапегі было перакананне: "Не толькі я, але і жыццё маё належыць Айчыне".

Нарадзіўся Леў Сапега 2 красавіка 1557 года ў маёнтку Астроўна Віцебскага ваяводства. У сямігадовым узросце бацькі аддалі сына ў прыватную школку пры нясвіжскім двары князя Мікалая Чорнага. Пасля ў сяброўстве з ягонымі сынамі Юрыем ды Станіславам вучыўся ў Лейпцыгскім універсітэце. Праўда, пазней Сапега скептычна ставіўся і да сваёй вучобы, і да свайго студэнцкага жыцця. "Кідаўся я тады на розныя спакусы і быў дурны як авечка, асабліва калі вучыўся ў нямецкіх ерытычных школах". Але ж і веды грунтоўныя атрымаў, і духам вальнадумствеў прасякнуўся. Малады Сапега так уразіў караля і вялікага князя Стэфана Баторыя веданнем законаў і лаціны, сваім разважлівым розумам, што той узяў яго да сябе сакратаром, а праз год прызначыў пісарам у Вялікакняжацкую канцылярыю. Кар'ера пачалася добра. Разам з канцлерам Астафеем Валовічам і падканцлерам Крыштанам Радзівілам ён працуе над стварэннем вышэйшага апеляцыйнага суда – Трыбунала Вялікага княства. Аднак найбольш глыбока прявіў сябе Сапега як заканадаўца, калі ўзначаліў камісію па складанні новага зводу законаў Вялікага княства – Статута.

Артыкулы Статута абмяркоўваліся на павятовых соймиках і агульнадзяржаўных з'ездах. Такім чынам, Статут быў плёнам заканадаўчай думкі "шляхецкага народа" Вялікага княства. Агульную рэдакцыю канчатковага варыянта зрабіў Леў Сапега, які на той час заняў пасаду падканцлера.

У прадмове да Статута Сапега выказаў свае погляды на прававое грамадства і дзяржаву. "А где опять право або Статут гору маеть, там сам Бог всим владиеть". На думку Сапегі, кожны чалавек павінен вызначыць тыя прававыя нормы, якія б пачціва ўзвышалі яго і засцерагалі ад ганебных учынкаў. А для дзяржавы зарукай яе росквіту і велічы ёсць прававы лад. "И тот то есть цель и конец всих прав на свете, тим все панства и королества стоять и в целости своей захованы бывають, где лихие помсту, а добрие плату относять". Закону павінны падпарадкоўвацца манарх і ўлады. Свае сцвярджэнні Сапега падмацоўвае выказваннем Цыцэрона: "Естесмо невольниками прав для того, обисьмо вольности ужывати могли".

Відавочна, што погляды Сапегі паўплывалі на гуманны характар многіх артыкулаў Статута. Для новага зводу чалавек, нават простага стану – гэта "Божье створенье", што вымагала і адпаведнай пашаны да яго. Гэтак у аснову закона былі пакладзены хрысціянскія прынцыпы. Статут абвяшчаў роўнасць усіх перад законам, усе павінны судзіцца "тим одним правом писаным". Узаконьвалася права на абарону з адвакатам: прызнавалася прэзумпцыя бязвінасці. Абараняліся правы жанчыны і непаўналетніх, пацвярджаўся і прынцып рэлігійнай свабоды, забаранялася трымаць у няволі свабодных людзей. Пад дзяржаўную ахову бралася прырода, уводзіўся парадак карыстання зямлёй, лесам, рэкамі і азёрамі. Статут абвяшчаў Вялікае княства Літоўскае самастойным княствам. На чале княства стаіць выбарны манарх – Вялікі князь Літоўскі, які дае клятву захоўваць прывілеі і вольнасці дзяржавы і правіць паводле закона. Уладу Вялікага князя падзяляе сенат – паны-рада і сойм, якія кантралююць ягонае праўленне і займаюцца заканадаўчай працай.

І не толькі палітычнымі сродкамі баранілі літвіны сваю незалежнасць, але і культурнымі. Як мера супраць апалячвання Літвы Статут прызнаваў беларускую мову дзяржаўнай. Сапега з гонарам за родную мову пісаў у прадмове да Статута: "А если которому народу в стыд прав своих не имети, поготовно нам, которые не обчим яким языком, але своим властным право списаные маем и кождого часу, чого нам потреба ку отпору всякое кривды, ведати можем".

Новы Статут, на думку Урада Вялікага княства, павінен быў выправіць "несправядлівасць" Люблінскай уніі, гарантаваць дзяржаве незалежнасць. Аднак, паводле Люблінскай канстытуцыі, "паправа" Статута зацвярджалася ўладаром са згоды супольнага сойму Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага. Ясна, што палякі на такую "паправу" ніколі не згадзіліся б. Перад дыпламатыяй Вялікага княства стаяла архіскладаная задача – адхіліць польскі бок ад ухвалы Статута. І вось выдаўся зручны момант. Пасля смерці ў 1586 годзе Стэфана Баторыя на месца ўладара Рэчы Паспалітай былі выбраны аж два кандыдаты – аўстрыйскі эрц-герцаг Максіміліян і шведскі каралевіч Жыгімонд Ваза. Паміж абодвума "ўладарамі" пачалася вайна. Свой голас Літва гатова была аддаць таму з іх, хто прызнае яе ўмовы і Статут. Урад княства даручыў гэтую нялёгкую дыпламатычную місію Льву Сапегу і Трокскаму ваяводзе Яну Глябовічу.

Калі яны прыехалі ў Кракаў, дык там ужо правіў каранаваны сваімі прыхільнікамі Жыгімонт Ваза. Літвінскія паслы прапанавалі Жыгімонту ўмовы, прыняўшы якія, ён мог стаць вялікім князем літоўскім. Жыгімонт, канешне, адмовіўся прыняць іх. Між тым, паслы ўважліва сачылі за развіццём барацьбы паміж Вазай і Габсбургам. Літвінскія віжы знаходзіліся ў абодвух варагуючых войсках. Нарэшце, 24 студзеня 1588 года каля мястэчка Бычын войска на чале з Жыгімонтавым апекуном канцлерам Янам Замойскім разбіла войска Габсбурга, а самога яго ўзялі ў палон.

Літвінскія віжы панеслі гэтую вестку ў Кракаў. На паўтара дня апярэдзілі яны польскіх вестуноў. Глябовіч і Сапега адзіныя ў Кракаве даведаліся аб перамозе Замойскага. 27 студзеня Літвінскае пасольства заявіла, што калі Жыгімонт і каранацыйны сойм не прымуць умоў Вялікага княства, дык паслы, не прызнаўшы Вазу вялікім князем, пакінуць Кракаў.

Рашучасць літвінаў напужала Жыгімонта і ягоных паплечнікаў. Не ведаючы пра перамогу Замойскага і палохаючыся пераходу Літвы на бок Максіміліяна, каранацыйны сойм саступіў літвінскім патрабаванням.

І так, Жыгімонт прызнаваў перамір'е з Масковіяй, абяцаў перадаць палову Лівоніі Літве і без вывучэння і абмеркавання зацвердзіў Статут. Гэта была адна з самых яскравых перамог у гісторыі літвінскай дыпламатыі. За паражэнне на Люблінскім сойме літвіны ўзялі ў палякаў рэванш, ды яшчэ які! Статут аднаўляў ва ўсёй паўнаце ўсе палітычныя страты Літвы пры уніі. Сваім росчыркам пад прывілеямі на прызнанне Статута Жыгімонт узаконіў існаванне Рэчы

Паспалітай як федэрацыі дзвюх дзяржаў. У той дзень літвінскае пасольства ад імя Вялікага княства Літоўскага прынесла клятву Жыгімонту Вазе як вялікаму князю літоўскаму. У сваю чаргу і Жыгімонт прынёс клятву паслам у захоўванні і прымнажэнні правоў, свабод і вольнасці Княства. 28 студзеня ён зацвердзіў і Статут. Адначасова са складаннем Статута падканцлер рыхтаваў усё патрэбнае для яго друкавання. Гэтым і можна растлумачыць тое, што ў тым жа 1588 годзе Статут пабачыў свет. Выдалі яго ў віленскай друкарні магілёўскіх мяшчан Кузьмы і Лукаша Мамонічаў.

Паводле Статута Літва (Беларусь) жыла да сярэдзіны XIX стагоддзя. На працягу 200 гадоў Статут з'яўляўся самым дасканалым зводам законаў у Еўропе і зрабіў значны ўплыў на еўрапейскую прававую думку. Прынамсі, ён паслужыў узорам пры стварэнні ў 1648 годзе расійскага зводу законаў Саборнага ўкладання. Статут перакладаўся на польскую, нямецкую, украінскую, расійскую, лацінскую і французскую мовы. Без перабольшання Статут можна назваць вялікай кнігай беларусаў. І па праву слава яе творцы, як рэдактару, складальніку, аўтару прадмоў, выдаўцу, належыць Льву Сапегу. Сваю тытанічную працу ён вобразна вызначыў гэтак: "Дарогу ладнейшую и снаднейшую кождому ку ведомости права показал".

"Спакой Айчыны да скону дзён буду сцерагчы" – вось мэта дзяржаўнай дзейнасці Льва Сапегі. Калі ў яго, які займаў вышэйшыя пасады канцлера і віленскага ваяводы, не даставала ўлады сцерагчы спакой, ён выкарыстоўваў словы перакананння. Пераканаўчымі довадамі імкнуўся стрымаць ахвотнікаў сеяць буру. Сапега выказваў погляды, сугучныя лепшым думкам мысліцеляў-гуманістаў. Гэтак, у лісце да уніяцкага архіепіскапа Язафата Кунцэвіча Сапега раіць яму адмовіцца ад насілля і выказвае ідэі талерантнасці і гуманізму. У часы, калі ўзмацніўся націск на праваслаўную веру, католік Сапега абараняе яе. "Я назваў гэтую праваслаўную веру Божым дарам, бо да яе сам Бог святым Духам далучае, а не гератычнай або схізматычнай, бо па-за царквы ніхто не далучаўся да Бога, не далучаўся да веры, паколькі чалавечыя намаганні тут дарэмныя". А вось як ён гатовы бараніць тых, хто чыніць пераслед праваслаўных: "Каждого такового я зараз позываю перед суд Божий страшний, и с ним это на страшном суде Христовом судитися хочу, где ему то нехай не будет отпущено". І калі ў Вялікім княстве захоўваўся рэлігійны мір, дык таму, што на ахове яго стаяў Леў Сапега. Яго слухаюцца, яго паважаюць, яго парады прымаюць. "Великій Лоне" – пачціва называлі Сапегу сучаснікі. Нават Жыгімонт Ваза, які спачатку непрыхільна ставіўся да яго, у цяжкія для сябе часы шукае ягонай падтрымкі.

Жыццё наносіла жорсткія ўдары па ідэалах Сапегі, нібыта выпрабоўвала іх на трывалась. І не без душэўнай скрухі даводзілася яму прызнаваць перавагу явы. Не суадносіны паміж ідэалам і жыццём прыгняталі Сапегу. Можна прымірыцца з суровай рэчаіснасцю – і гэта таксама выхад. Сапега не мірыцца. Не. Ён не бярэ на сябе місію ашчаслівіць чалавецтва і не паўстае супраць тагачаснага становішча грамадства, але па магчымасці змякчае супярэчнасці жыцця. Можа быць, для многіх яго сучаснікаў гуманнасць канцлера ўспрымалася як дзівацтва. "У вас халоп – халопам, а ў мяне – вяльможны, яснавяльможны, бо калі я халопа мець не буду, пэўна, яснавяльможным не буду", – тлумачыў Сапега сваю павагу да простага чалавека. Ён "прымучваў" сваіх падданых, але лічыў нармальным, што яго яснавяльможнасць забяспечваюць з поту і мазаля халопы.

Змяніць грамадства ён не мог, каб нават і захацеў. Але вось змяніць палітычнае становішча ва Усходняй Еўропе першаму дыпламату Вялікага княства было па сілах. Ён выступіў з ініцыятывай уніі паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай.

У 1600 годзе Леў Сапега на чале пасольства прыехаў у Маскву, каб абмеркаваць праект уніі з рускім царом Барысам Гадуновым і думнымі баярамі. На сустрэчы з баярамі Сапега заклікаў іх садзейнічаць заключэнню саюза.

"Мы з вамі славяне, адзіны народ. Бога з вамі хвалім адзінага. І адну чэсць, хвалу яму аддаём. Хіба гэта мала, каб не паразумецца? Слушна тады было б наперад сваіх манархаў звесці ў вечную прыязнь, ды прывесці да таго іх панствы. Каб паміж сабой міласць і згоду вечную ўзялі і палякаў рэванш, ды яшчэ які! Статут аднаўляў ва ўсёй паўнаце ўсе палітычныя страты Літвы пры уніі. Сваім росчыркам пад прывілеямі на прызнанне Статута Жыгімонт узаконіў існаванне Рэчы Паспалітай як федэрацыі дзвюх дзяржаў. У той дзень літвінскае пасольства ад імя Вялікага княства Літоўскага прынесла клятву Жыгімонту Вазе як вялікаму князю літоўскаму. У сваю чаргу і Жыгімонт прынёс клятву паслам у захоўванні і прымнажэнні правоў, свабод і вольнасці Княства. 28 студзеня ён зацвердзіў і Статут. Адначасова са складаннем Статута падканцлер рыхтаваў усё патрэбнае для яго друкавання. Гэтым і можна растлумачыць тое, што ў тым жа 1588 годзе Статут пабачыў свет. Выдалі яго ў віленскай друкарні магілёўскіх мяшчан Кузьмы і Лукаша Мамонічаў.

Паводле Статута Літва (Беларусь) жыла да сярэдзіны XIX стагоддзя. На працягу 200 гадоў Статут з'яўляўся самым дасканалым зводам законаў у Еўропе і зрабіў значны ўплыў на еўрапейскую прававую думку. Прынамсі, ён паслужыў узорам пры стварэнні ў 1648 годзе расійскага зводу законаў Саборнага ўкладання. Статут перакладаўся на польскую, нямецкую, украінскую, расійскую, лацінскую і французскую мовы. Без перабольшання Статут можна назваць вялікай кнігай беларусаў. І па праву слава яе творцы, як рэдактару, складальніку, аўтару прадмоў, выдаўцу, належыць Льву Сапегу. Сваю тытанічную працу ён вобразна вызначыў гэтак: "Дарогу ладнейшую и снаднейшую кождому ку ведомости права показал".

"Спакой Айчыны да скону дзён буду сцерагчы" – вось мэта дзяржаўнай дзейнасці Льва Сапегі. Калі ў яго, які займаў вышэйшыя пасады канцлера і віленскага ваяводы, не даставала ўлады сцерагчы спакой, ён выкарыстоўваў словы перакананння. Пераканаўчымі довадамі імкнуўся стрымаць ахвотнікаў сеяць буру. Сапега выказваў погляды, сугучныя лепшым думкам мысліцеляў-гуманістаў. Гэтак, у лісце да уніяцкага архіепіскапа Язафата Кунцэвіча Сапега раіць яму адмовіцца ад насілля і выказвае ідэі талерантнасці і гуманізму. У часы, калі ўзмацніўся націск на праваслаўную веру, католік Сапега абараняе яе. "Я назваў гэтую праваслаўную веру Божым дарам, бо да яе сам Бог святым Духам далучае, а не гератычнай або схізматычнай, бо па-за царквы ніхто не далучаўся да Бога, не далучаўся да веры, паколькі чалавечыя намаганні тут дарэмныя". А вось як ён гатовы бараніць тых, хто чыніць пераслед праваслаўных: "Каждого такового я зараз позываю перед суд Божий страшний, и с ним это на страшном суде Христовом судитися хочу, где ему то нехай не будет отпущено". І калі ў Вялікім княстве захоўваўся рэлігійны мір, дык таму, што на ахове яго стаяў Леў Сапега. Яго слухаюцца, яго паважаюць, яго парады прымаюць. "Великій Лоне" – пачціва называлі Сапегу сучаснікі. Нават Жыгімонт Ваза, які спачатку непрыхільна ставіўся да яго, у цяжкія для сябе часы шукае ягонай падтрымкі.

Жыццё наносіла жорсткія ўдары па ідэалах Сапегі, нібыта выпрабоўвала іх на трывалась. І не без душэўнай скрухі даводзілася яму прызнаваць перавагу явы. Не суадносіны паміж ідэалам і жыццём прыгняталі Сапегу. Можна прымірыцца з суровай рэчаіснасцю – і гэта таксама выхад. Сапега не мірыцца. Не. Ён не бярэ на сябе місію ашчаслівіць чалавецтва і не паўстае супраць тагачаснага становішча грамадства, але па магчымасці змякчае супярэчнасці жыцця. Можа быць, для многіх яго сучаснікаў гуманнасць канцлера ўспрымалася як дзівацтва. "У вас халоп – халопам, а ў мяне – вяльможны, яснавяльможны, бо калі я халопа мець не буду, пэўна, яснавяльможным не буду", – тлумачыў Сапега сваю павагу да простага чалавека. Ён "прымучваў" сваіх падданых, але лічыў нармальным, што яго яснавяльможнасць забяспечваюць з поту і мазаля халопы.

Змяніць грамадства ён не мог, каб нават і захацеў. Але вось змяніць палітычнае становішча ва Усходняй Еўропе першаму дыпламату Вялікага княства было па сілах. Ён выступіў з ініцыятывай уніі паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай.

У 1600 годзе Леў Сапега на чале пасольства прыехаў у Маскву, каб абмеркаваць праект уніі з рускім царом Барысам Гадуновым і думнымі баярамі. На сустрэчы з баярамі Сапега заклікаў іх садзейнічаць заключэнню саюза.

"Мы з вамі славяне, адзіны народ. Бога з вамі хвалім адзінага. І адну чэсць, хвалу яму аддаём. Хіба гэта мала, каб не паразумецца? Слушна тады было б наперад сваіх манархаў звесці ў вечную прыязнь, ды прывесці да таго іх панствы. Каб паміж сабой міласць і згоду вечную ўзялі і палякаў рэванш, ды яшчэ які! Статут аднаўляў ва ўсёй паўнаце ўсе палітычныя страты Літвы пры уніі. Сваім росчыркам пад прывілеямі на прызнанне Статута Жыгімонт узаконіў існаванне Рэчы

Шлях у космас

Казімір Семяновіч (1600 - 1651)

Ягоны геній апярэдзіў час і толькі ў XX стагоддзі знайшоў сваё ўвасабленне ў практыцы. Чалавецтва пераадолела зямное прыцяжэнне і вырвалася ў космас. Мала хто ведаў, што ідэя шматступеньчатай ракеты належыць беларусу Казіміру Семяновічу. Першынство прыпісвалася то рускаму вучонаму К.Цыялкоўскаму, то бельгійскаму інжынеру Р.Бінгу, то амерыканцу Р.Годарду. Аднак гістарычная крыніца сведчыць аб прыярытэце Казіміра Семяновіча. Менавіта ён у 1650 годзе ў сваёй кнізе "Вялікае мастацтва артылерыі" ўпершыню апісаў канструкцыю шматступеньчатай ракеты, якая і стала прататыпам сучасных касмічных караблёў. За адно гэтае вынаходніцтва імя Казіміра Семяновіча вартае быць у спісе славутых і вялікіх людзей сусветнай цывілізацыі.

Скупыя звесткі захаваліся пра жыццёвы шлях Казіміра Семяновіча. Хоць і лічыў ён сябе "шляхціцам-літвінам", але, верагодна, паходзіў з роду дробных беларускіх князёў Семяновічаў. З дакументаў вынікае, што ў XIV стагоддзі ім належалі "двор Быхово" і ўладанні ў Дубровенскай зямлі.

У 1634 годзе Казімір Семяновіч удзельнічаў у аблозе рускага горада Белы, а праз дзесяць гадоў, 30 студзеня 1644 года – у бітве з крымскімі татарамі. У гэтай бітве яго ўразіла дымавая заслона, якой татарскія феерверкеры выратавалі сваю адступаючую конніцу. Казімір Семяновіч, пэўна, тады яшчэ быў не вельмі дасведчаны ў артылерыйскім мастацтве, а таму палічыў, што феерверкі "з дапамогаю д'ябла туманом ды параю зацямнілі сонца на пабаявішчы". Можа, менавіта тады і ўзнікла ў яго жаданне авалодаць усімі ведамі артылерыйскага мастацтва. У сваёй кнізе ён успамінаў: "...неўзабаве я прысвяціў сябе дэталёваму вывучэнню такога мастацтва, да якога меў такую вялікую прагу, так што я ніколі і нідзе не шкадаваў тых выдаткаў (хоць гэта і дужа змяншала мае асабістыя сродкі), калі знаходзіў штосьці, чаго яшчэ ці не ўмеў, ці не паспрабаваў на практыцы. Дзяючы разумным парадам сяброў і ўласным роздумам я зразумеў, што ніколі не здолею дасягнуць пастаўленай мэты, калі буду вывучаць гэтае мастацтва без сістэмы... Для гэтага я вывучаў вельмі шмат навук, як вызваленых, так і механічных. У навукі вызваленыя я залічваю арыфметыку, геаметрыю з яе часткамі, механіку, а г.зн. статыку, гідраўліку, пнеўматыку, грамадзянскую і ваенную архітэктуру (г.зн. фартыфікацыю), графіку, оптыку і тактыку. Засвоіў я таксама пэўныя звесткі з фізікі, хіміі". Можна ўявіць гэтую тытанічную працу – на такое быў здольны толькі валявы і таленавіты чалавек, і на здзяйсненне такога быў неабходны моцны імпульс. І ён у Семяновіча быў– гэта "жаданне паслужыць айчыне і сваім суродзічам...".

Дома дастатковых ведаў Казімір Семяновіч не атрымаў, а таму ў 1645 годзе ён адправіўся ў Нідэрланды. А каб навучыцца артылерыйскаму мастацтву на практыцы, ён уступіў у войска Фрыдырыка Генрыха Аранскага. Гэта была патрэбная школа, і Семяновіч навучыўся шмат чаму: "...у час вельмі многіх славутых аблогаў у Нідэрландах, адбываючы практыку вайсковую і выконваючы абавязкі, звязаныя з ёю, а таксама выхоўваючы годнасць артылерыйскую, запісаў шмат рэчаў, частку сам вынайшаў, нечаму навучыўся у іншых", – прызнаваўся ён. І калі Семяновіч у 1646 годзе па выкліку караля Уладзіслава IV вярнуўся ў Рэч Паспалітую, то быў ужо дасведчаны і даволі аўтарытэтны ў артылерыйскай справе чалавек. Кароль назначыў яго інжынерам у Польскай артылерыі. Можна не сумнявацца, што і на гэтай пасадзе Семяновіч працягваў назапашваць і ўдасканальваць свае веды. Ягоны аўтарытэт расце. У 1648 годзе інжынер становіцца намеснікам начальніка артылерыі. На бяду, а можа, на шчасце, вайсковая кар'ера Семяновіча не склалася. Відаць, начальнік артылерыі Крыштоф Арцішэўскі з-за зайздрасці абвінаваціў Семяновіча ў казнакрадстве, маўляў, той не даплаціў артылерыстам і фурманам. Сума, якую нібыта прысвоіў Семяновіч, складала каля васьмі тысяч залатых. Абвінавачанне – сур'ёзнае, і ў выніку яго пацвярджэння Семяновіча чакала суровае пакаранне. Верагодна, Семяновіч апраўдаўся, але не захацеў служыць у падначаленні Арцішэўскага і ў званні генерал-лейтэнанта выйшаў у адстаўку. Цяпер мог прысвяціць сябе напісанню кнігі аб вялікім мастацтве артылерыі.

Напрыканцы 1648 года Казімір Семяновіч зноў прыехаў у Нідэрланды. На гэты раз не як вучань, а як настаўнік. У яго ўжо было дастаткова ведаў наконт артылерыі, каб падзяліцца імі з іншымі. Яшчэ два гады прайшлі ў напісанні і падрыхтоўцы кнігі да друку. Значную дапамогу аказаў Семяновічу ягоны апякун эрцгерцаг Леапольд-Вільгельм Габсбург, які быў намеснікам іспанскага караля ў Нідэрландах. І вось у 1650 годзе ў Амстэрдаме ў друкарні Яна Янсана было надрукавана "Вялікае мастацтва артылерыі".

Мэту сваёй кнігі Семяновіч бачыў гэтак: "...выданнем гэтае працы я хацеў бы зрабіць паслугу маёй Радзіме і маім суайчыннікам, якія заўсёды выяўлялі вялікую схільнасць да гэтай навукі і якія цанілі яе болей, чым іншыя галіны вайсковай навукі, аднак жа да гэтага часу не мелі кніг, па якіх маглі б вывучаць яе". Як успрынялі суайчыннікі працу Семяновіча, невядома, а вось іншаземцы яе ацанілі. На працягу паўтара стагоддзя гэтая кніга была падручнікам па артылерыі. Адразу ж пасля выхаду яе пераклалі на французскую мову, пазней – на нямецкую, англійскую і іншыя.

У кнізе Казімір Семяновіч даў усю паўнату ведаў аб артылерыі, якія набыў за гады тэарэтычнага і практычнага вывучэння артылерыйскага мастацтва, амаль 260 твораў, пачынаючы з антычных, выкарыстаў у сваёй працы аўтар. У пяці раздзелах распавядаецца пра ўсё, што датычыцца артылерыі – пра метады вырабу пораху і запальных рэчываў, выкарыстанне выбуховых прыстасаванняў і г.д. У раздзеле "Аб ракетах" Семяновіч піша аб канструкцыях і спосабах вырабу разнастайных ракет. Многія тыпы ракет прапанаваў Семяновіч упершыню, і ў прыватнасці састаўныя і шматступеньчатыя. Ён не робіць сакрэтаў са сваіх доследаў – друкуе табліцу адносін дыяметра ракеты да яе даўжыні. Каб скласці яе, Казіміру Семяновічу давялося правесці шмат эксперыментаў, на якія былі патрачаны "вялікія грашовыя выдаткі". Адкрыццём Семяновіча было і тое, што ён вынайшаў спосаб стабілізацыі палёту ракеты. "Вялікае мастацтва артылерыі" адразу пасля выхаду было заўважана. У 1651 годзе яно перакладаецца на французскую мову, у 1676 годзе з'явіўся нямецкі пераклад, у 1729 – англійскі, праца перакладалася на галандскую і дацкую мовы. Натхнёны поспехам, Казімір Семяновіч напісаў працяг сваёй кнігі, дзе разглядаў новыя пытанні і праблемы артылерыйскага мастацтва. Семяновіч хацеў апісаць зробленае ім вынаходніцтва. "Гэта мая новая вынаходка, у якой змяшчаюцца ўсе нашыя веды, яна адна перасягае шмат якія іншыя прыстасовы і замяняе іх усе, бо з яе дапамогай замяраем згодна вагамеру калібр гарматных ствалоў; ... адзначаем вагу і памеры як вадкіх, так і сыпкіх рэчываў, і меры адлегласці; нацэльваем гарматы і марціры, падымаем або апускаем, і маем дакладна перад вачыма моц гармат пры траякім нацэльванні, а менавіта гарызантальны, звычайны і ў найбольшым падвышэнні... Акрамя таго, адмяраем адлегласць месца, вышыню і глыбіню аб'ектаў. Фігуры пляскатыя пераносім з аркуша на поле або з поля на аркуш..." Што ж гэта за вынаходніцтва? Гісторык Міхась Ткачоў меркаваў, што гэта – універсальныя аптычна-механічныя прылады накшталт нівеліра, бусолі ці кіпрэгеля.

Збіраўся Семяновіч разгледзець некаторыя геаметрычныя, астранамічныя і геаграфічныя пытанні. "Як толькі ўсё гэта ў адпаведных месцах дойдзе да свядомасці кожнага, тады адбудзецца вера ў мае словы". Рукапіс новай працы Казіміра Семяновіча не быў надрукаваны. Магчыма, у ім падаваліся сакрэтныя на той час звесткі пра артылерыю? Ды яшчэ унікальнае вынаходніцтва! А ваенныя таямніцы заўсёды хаваліся ад людзей. Дарэчы, як мяркуе "піянер касманаўтыкі" амерыканскі вучоны Ары Штэрнфельд, Казімір Семяновіч быў забіты раменнікамі-піратэхнікамі за тое, што ў сваёй кнізе выдаў сакрэты і таямніцы артылерыйскага мастацтва.

Як закончыўся жыццёвы шлях Казіміра Семяновіча, невядома, але зробленае ім прадвызначыла развіццё артылерыйскага мастацтва як навукі на стагоддзі і ўказала чалавецтву шлях у космас.

"Быў славаю ў баі, святлом у радзе..."

Мікалай Радзівіл Сіротка (1549 - 1616)

Сын славутага Мікалая Радзівіла Чорнага, ён быў прыкметнай асобай у палітычным жыцці Рэчы Паспалітай. Але славу палітыка зацьміла слава культурнага дзеяча, мецэната і літаратара. "Узнёс святыні Богу, крэпасці Айчыне, калегію навукам, прыстанак гаротным і ўцекачам ад свету, быў славаю ў баі, святлом у радзе: адведаў і спазнаў зямлю. Калі б мы мелі двух такіх мужоў, без цяжкасці перагналі б Італію". Вось такая пахвала Мікалаю Сіротку ягоных сучаснікаў. Ведаючы зробленае Сіроткам для беларускай культуры, успрымаеш гэтую пахвалу заканамерна, бо ён заслужыў высокіх слоў і добрай памяці.

У маладосці Сіротка атрымаў выдатную адукацыю ў Страсбургскім і Цюрынгскім універсітэтах, шмат падарожнічаў па Еўропе, пабыў у Нямеччыне, Францыі, Італіі. Вярнуўшыся на радзіму, Сіротка дзейсна ўключыўся ў дзяржаўныя справы, то на чале сваёй харугвы бароніць Айчыну ад ворага, то на соймах, то ў сенаце, то ў дыпламатычных перамовах дбае аб яе патрэбах. У 1572 годзе ездзіў у Парыж, дзе ад імя Вялікага княства Літоўскага прызнаў Генрыха Валуа вялікім князем літоўскім. А гэта ўжо было сведчанне аўтарытэту Сіроткі ў Дзяржаве. Ён набірае палітычную вагу, і ўжо ад яго шмат у чым залежаў лёс краіны і народа. Але асабісты лёс Мікалая Сіроткі залежаў ад прыкрай хваробы. Сіротка на час пакінуў дзяржаўныя справы і лячыўся ў замежных лячэбніцах, але без поспеху. У адчаі ён успрыняў хваробу як Божую кару за грахі юнацтва, а таму вырашыў весці пабожнае жыццё. Пад уплывам езуітаў Сіротка пераходзіць з пратэстанцтва (якое ўжо будзе лічыць за ерась) у каталіцызм. "А як, калі чалавек целам хварэе, дарма пра яго старанна дбае, калі пакідае душу без увагі, таксама ж і я, пабачыўшы, што лекары нічога справіць не могуць, усім сэрцам сваім праз споведзь святую і прыняцце найсвяцейшага таемства звярнуўся да Госпада Бога, пакорліва просячы, каб, грахі маладосці маёй дараваўшы, падказаў бы сэрцу майму, што з Яго Найсвяцейшае велічы хвалою вечнай было б". І даў ён зарок, што "як толькі мяне міласэрны Госпад Бог да ранейшага здароўя верне, магілу Збаўцы Госпада майго ў Ерусаліме наведаю". Ажыццяўленне зароку давялося адкласці на няпэўны тэрмін. Пачалася вайна з маскавітамі, і Сіротка ўзначаліў асабістую харугву ў семсот вершнікаў. Пад Полацкам у жніўні 1579 года падчас штурму ён атрымаў раненне – кавалак расшчэпленага дрэва ўдарыў яму ў галаву, пашкодзіўшы вока. Зноў паездка ў Італію на лячэнне. Вярнуўшыся на радзіму, Сіротка ўдзельнічае ў паходзе Стэфана Баторыя на Пскоў. І толькі ў 1572 годзе ён змог нарэшце выправіцца ў пілігрымку да Святой зямлі. Сам Папа Рымскі Рыгор XIII блаславіў яго на падарожжа. 19 верасня Радзівіл адправіўся ў дарогу з роднага Нясвіжа. Дабраўшыся да Венецыі, пілігрым правёў там усю зіму. Вясной 1583-га ён ступіў на борт карабля. Нялёгкім было падарожжа. Марскія штормы, цяжкі шлях пад спякотным сонцам, небяспечныя сустрэчы на дарогах з ліхімі рабаўнікамі. Нічога вартага ўвагі не абмінуў Сіротка. Ён наведвае і аглядае помнікі мінулага, славутыя мясціны, храмы. Убачанае занатоўвалася ў дарожным дзённіку. "Не ўсё я ўжо там вельмі пільна аглядаў, але, як кажуць, што само ў вочы лезла, тое і запісваў. Тое, пра што толькі чуў, мала я дзе занатоўваў, бо расповедаў людскіх не меў я намеру запісваць, а хто там бываў, прызнае, што шмат я чаго досыць падрабязна, а ўсё праўдзіва, апісаў", – адзначаў Сіротка.

Два тыдні прысвяціў Сіротка наведванню хрысціянскіх святынь у Ерусаліме, тройчы прыходзіў да Хрыстовай труны, пабываў ён і ў Бетлееме. "Князь з Алыні і Нясвіжа, Граф на Шкулоўцу і Міры" быў узведзены Ерусалімскім канвентам бернардзінцаў у годнасць Рыцара Божай труны. Вялікі гонар! Шчодры князь аддзячыў бернардзінцам багатымі дарамі і заказаў сабе лампаду каля Божай труны.

На зваротным шляху Сіротка наведаў Егіпет, Экзатычная краіна ўразіла яго. У сваім дзённіку ён апісвае і помнікі культуры, і дзіўныя звычаі, і выгляд звяроў і дрэў. Усё гэта будзе не толькі цікава чытачу будучай кнігі, якую Сіротка задумаў напісаць, але і дапаможа "пашырыць кругагляд сваякоў". Гэтая высакародная задума вяла Сіротку ў самыя знакамітыя мясціны, нават і небяспечныя для жыцця. Запал даследчыка прачнуўся ў ягонай душы. Турэцкія ўлады пачалі падазраваць, што пілігрым, які так руплива цікавіўся краем, – шпег. Турэцкі султан нават выдаў загад схапіць яго і прывезці ў Канстанцінопаль. Хоць Сіротку і ўдалося выехаць з Егіпта, аднак небяспекі ён не пазбегнуў. Некалькі сутак карабель, на якім плыў пілігрым, насіла па штармавым моры. А ў Італіі за Радзівілам было ўчынена сапраўднае паляванне рабаўнікоў. На адной з дарог яго злавілі і абабралі да ніткі. Вось так, з прыгодамі, дабраўся Сіротка, нарэшце, да Венецыі, адкуль і выправіўся на радзіму. 7 ліпеня 1584 года вярнуўся ён да бацькоўскага парога ў Нясвіж. Падарожжа ў Святую Зямлю і Егіпет Сіротка апісаў у кнізе "Пэрэгрынацыя", якая выйшла ў 1601 годзе на лацінскай мове. Для дапытлівага чытача гэта быў каралеўскі падарунак. Сіротка правёў яго па святых мясцінах, даў магчымасць адчуць містычную прыгажосць зямлі, на якой жыў Хрыстос. І кнігу заўважылі. Яе перакладалі на польскую, нямецкую, расійскую мовы, неаднаразова перавыдавалі. І пілігрымка паўплывала на характар Радзівіла. Там, у доўгай дарозе, неаднойчы давялося сустракацца з чалавечым высакароднаствам, дабрынёй, дапамогай. Князь з удзячнасцю ўспрымаў гэтыя светлыя праявы людскіх душ. І сам дапамагаў у нялёгкую хвіліну людзям, не шкадаваў грошай, каб выкупіць з турэцкай няволі хрысціян. Вярнуўшыся дадому, ён заснаваў брацтва міласэрнасці, адчыніў шпіталь. Дапамагчы няшчаснаму лічыў ён за святы абавязак. "Няхай мяне завуць не Радзівіл, а Рад Жывіл", – казаў ён. Вось лепшая ўзнагарода ад людзей – іх добрае слова.

Чалавек, які дакрануўся да вечнасці, ведаў сапраўдную каштоўнасць жыцця. Чаго здзіўляцца таму, што Сіротка адмаўляецца ад высокіх дзяржаўных пасад і галоўным чынам прысвячае сябе культурна-асветніцкай працы. Ягонымі намаганнямі правінцыйны і маленькі Нясвіж расквітнеў. Сіротка дамогся ад вялікага князя надання гораду Магдэбургскага права – самакіравання. Заснаваў ён у Нясвіжы жаночы каталіцкі манастыр Бернардзінак і манастыр Бернардзінцаў, езуіцкі калегіум, адчыніў школы і шпіталь. Запрошаны князем італьянскі дойлід Ян Марыя Бернардоні пабудаваў у горадзе другі ў Еўропе храм у стылі Барока. На месцы старога зруйнаванага замка пачалося ўзвядзенне мураванага на праекту таго ж Бернардоні. За нейкія лічаныя гады горад змяніў сваё аблічча, набыў непаўторнае зачараванне прыгажосці і стаў першым з культурных цэнтраў Беларусі. Па задуме Сіроткі, Нясвіж пав

Да 60-годдзя паэта Міколы Маляўкі

Ад роднай нёманскай зямлі

Чую галасы
Недзе за гародамі
Едуць маразы
З белымі бародамі.

Снег глыбокі, лёд...
Коні прытаміліся.
Ля маіх варот
Маразы спыніліся.

Гэтыя радкі - з першага зборніка вершаў Міколы Маляўкі "Едуць маразы", які выйшаў у 1966 годзе. Я іх прачытаў у тым жа самым годзе, будучы студэнтам-першакурснікам філфака БДУ. Прачытаў, як і многія мае сябры, і здзівіўся, як лёгка аўтар валодае паэтычным словам, чэ радкі так, што імгненна запамінаюцца. Я не ведаў яшчэ асабіста Міколу, хоць ён быў маім земляком і заканчвалі мы адну Мікалеўшчынскую сярэдняю школу імя Якуба Коласа Стаўбцоўскага раёна. Яго Мікалаеўшчыну і маю Белькаўшчыну раздзяляюць тры кіламетры праз Нёман.

Пасля школы ён добраахвотна завербаваўся на паўночныя лесараспрацоўкі ў далёкую Карэлію.

Паўзуць з дарогі ў роў
Глыбокіх трэшчын
змейкі,
І нават ля кастроў
Не грэюць целагрэйкі.

Мікола Аляксандравіч паспрабаваў у свой час журналісцкага хлеба - у стаўбцоўскай "раёнцы" і ў нясвіжскай газеце "Чырвоны сцяг", ужо маючы за плячыма грунтоўную універсітэцкую адукацыю.

Нейкі час паэт працаваў старшым рэдактарам рэспубліканскага метадычнага кабінета Міністэрства культуры. Сёння ён супрацоўнік часопіса "Вясёлка".

Дзеці, вучні... Гэтыя вельмі ўдзячныя чытачы маглі б, без перабольшання, калі б можна было зняць прозвішча аўтара, пазнаць Міколу Маляўку па яго стылю і почырку. А ён у яго непаўторны як у творах для дарослых, так і для маленькіх.

Усе кнігі Міколы Маляўкі пранізвае любоў да Айчыны, да роднай коласаўскай зямлі, нёманскіх берагоў, ягадна-грыбных бароў. Разам з тым, акрамя пранікнёна-лірычных вершаў, паэт піша і публіцыстычныя творы. Яго асабістая праўда гучыць як агульная праўда ўсёй Беларусі. Але найбольш ён адметны ў лірыцы.

Здалёк усміхніся
вачыма,
Пакліч у дзяцінства
здалёк,
Мой Нёман -
малая радзіма,
Вялікай любові выток.
Я зноў вярнуся
На сваю зямлю,
Замру над нёманскаю
кручай -
І настальгіі смагу
наталю
Любоўю - сілаю гаючай.

* * *

Хто з паэтаў не ўслаўляў славутай ракі Нёман? Сёлета выйшла з друку кніга "Бацька наш Нёман", якая ўмясціла творы 155 аўтараў. Тут і класікі розных народаў XIX і XX стагоддзяў - польскі А.Міцкевіч, рускі Ф.Цютчаў, польска-беларускі У.Сыракомля, беларускія Я.Колас, Я.Купала, М.Багдановіч і сённяшнія паэты.

Сярод іх выступіў з вялікай нізкай вершаў пра Нёман і Мікола Маляўка. Яго творы пра Нёман - непаўторныя. У іх ёсць нейкая асаблівая таемнасць, шчымлівасць, ледзь не паганскае пакланенне. Для яго - гэтая рака, як і для вялікага земляка Якуба Коласа, больш чым рака. Гэта цэлая філасофія, жыццёвая знакавасць, бяздонная крыніца, якая сілкуе душу паэта, з якой чэрпае натхненне для творчасці.

Ты ў жыцці маім -
апора,
Не разлучыць нас
і далеч,
Бо ўпадаеш ты
не ў мора,
А ў душу маю ўпадаеш.

* * *

Асобнае месца ў творчасці Міколы Маляўкі займае яго славутая Мікалаеўшчына. Пра яе ў яго вельмі шмат вершаў. Тут і неардынарнасць вёскі, своеасаблівыя жыхары, яе праблемы.

Вось як хораша сказана ў вершы "Спяваюць мікалаўцы", прысвечаным фальклорнаму калектыву "Коласавы землякі".

Цешыць двухгалоссе,
трохгалоссе,
А падхопяць
мікалаўцы ўсе -
Сонцам наліваецца
калоссе,
Дасп'яваюць яблыкі
ў расе.

Слухаюць сучаснікі
сягоння,
Слухаюць далёкія вякі,
Як лунае тут,
у Наднямонні,
Голас ваш чароўны,
землякі.

Песняй клічуць
родныя прасторы,
І лячу, як жаваранак, я -
Рад, што ў вёсак
шматгалосым хоры
Ёсць
і Мікалаўшчына мая.

А верш М.Маляўкі "Вуліца бескароўная", заснаваны на фактах роднай вёскі, атрымаў шырокі рэзананс.

* * *

У поўнай гармоніі з, паэзіяй для дарослых жыве ў Міколы Маляўкі і творчасць для дзяцей. Асобу паэта адразу пазнаеш і тут. Бо адносіцца ён да твораў дзіцячых з гэткай жа, а можа, і большай паэту адказнасцю. Ім напісана нямала дзіцячых кніжак, у якіх адлюстравана жыццё сённяшніх хлопчыкаў і дзяўчынак. У кожным творы заўсёды прысутнічае добрая душа паэта, і абавязкова паэту заўсёды спаўна рожнічае досціп, вобразнасць, даступнасць.

Летась выйшла з друку кніга выбраных твораў "Папялушка". Хто набыў яе - ніколі не пашкадуе. Бо тут сабрана ўсё лепшае, што стварыў М.Маляўка для дзяцей. Вершы, казкі, загадкі, песні, сказы, забаўлянкі, паэмы, народныя творы, апрацаваныя ім... Вось няпоўны пералік жанраў, якія дорыць дзецям паэт. Асобна стаіць тут буквар у вершах, або азбука. "Літары-сваячкі" - так назваў яго ён. Па гэтым "буквары" дзіця сапраўды можа не толькі навучыцца алфавіту, але і ўведаць шмат прыгожага, непаўторнага, што існуе ў жыцці.

* * *

У нас, землякоў, вельмі блізкія стасункі. Мы часта сустракаемся - то ў Мінску, то ў Мікалаеўшчыне, на берагах Нёмана. Асабіста для мяне гэта заўсёды яшчэ адно адкрыццё старэйшага сябра. Я, напрыклад, не ведаў, што ён можа з раніцы да вечара хадзіць у адзіноце па лесе, тады, калі пачынаецца грыбны сезон. Бярэ з сабой кош і сцізорык, кавалак хлеба і сала, і менавіта там, у лесе, часцей нараджаюцца ў яго вершы, а не за пісьмовым сталом. І гэтым ён ужо непаўторны. А яшчэ характар у Міколы - выключны. Пэўна, ён ад роднай нёманскай прыроды: спакойны, ураўнаважаны, разважлівы. За ўсё жыццё, як кажуць, не пакрыўдзіў і мухі. І гэтая дабрыня - вялікі плюс паэту. Можа, таму і спрыяе яму Бог, які закінуў у яго душу сваю іскру,- рэгулярна выходзяць кнігі.

Вось зборнікі, якія выходзілі ў выдавецтве "Мастацкая літаратура": "Едуць маразы", "Жалеза", "Лотаць", "Круг", "Эстакада", "Дар", "Аднавякоўцы", "Зімні дождж", "Ручнічок на крыжы", "Покуць"; у выдавецтве "Юнацтва": "Дзед і ўнучка", "Салодкі ляд-зяш", "Як дом будавалі", "Вясёлая азбука", "Дзе жывуць казкі", "Запрашаем на калядкі", "Папялушка".

Мікола Маляўка - лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А.Куляшова, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Высокі лёс у майго земляка. І хоць ён адзначае шэсцьдзесят зімаў і вёснаў, але поўны сіл і энергіі. Яго паэтычнае слова не ведае стомы.

Ну а слова, яно -
не вечнае,
Калі ў слове
няма адкрыцця,
Калі слова
не забяспечана
Залатым запасам
жыцця.

Яўген ХВАЛЕЙ,
пісьменнік.

Мікола МАЛЯЎКА

Бачыцца здалёк

Прыемна бачыцца
здалёк
Альбуць - музейны
домік светлы,
І жоўты
лісцік-матылёк,
Што мройна кружыцца
ў паветры.

Даўно забыўся
год і дзень,
Даўно забыліся і госці,
І сам я,
сённяшняга цень,
Застаўся там,
у маладосці.

А ён,
той лісцік-матылёк,
Усё яшчэ не ўпаў,
адзіны,
Прыемна бачыцца
здалёк -
І кліча
ў родныя мясціны.

Не было для вас чужых дзяцей...

Лянгіне Міхайлаўне ЦВІРКА

Мы сваіх настаўнікаў
не цэнім,
А яны, працуючы на час,
Цэлы век,
Да пенсіі сумленнай,
Вучаць
і падтрымліваюць нас.
Дбалі вы,
Настаўніца ад Бога,
Пра дзяцей,
пра іх духоўны хлеб.
Апякалі і мяне -
Малога,
І пазней, калі душой
акрэп.
Памяць зноў
у кадрыках пакажа,
Бы дакументальнае
кіно,
Як гарэла,
Гледзячы на ваша,
І маё бяссоннае акно.
Па вайне,
Асірацэйшы рана,
Вы жылі за нас
не багацей.
Не было для вас бацькоў
абраных,
Не было для вас
чужых дзяцей.
Ушчуваннем,
Ласкавай усмешкай,
Словам дарагім,
як запавет,
Вы спрыялі,
каб сваёю сцежкай
Кожны з нас ішоў
у новы свет.
За духоўны хлеб
у роднай школе,
За свайго ўжо
апякунства стаж
Вам удзячны я,
Маляўка Коля, -
Пасівелы
выхаванец ваш.

І цяпер прыемна
на падворку
Пахвалу пачуць
ад вас найперш,
Быццам мне паставіце
пяцёрку
За любоў да кніг,
За добры верш.
Рады я, што ціхім
адвячоркам
Не ў мінулых
кадрыках кіно,
А ў жыцці гарыць яшчэ,
Як зорка,
Ваша мікалаўскае акно.

Падары мне...

Падары мне светлыя
ўспаміны,
Падары шчаслівыя
хвіліны
Першага спаткання,
першых слоў,
У якіх - пяшчота
і любоў.

Падары мне светлыя
ўспаміны,
Падары шчаслівыя
хвіліны
Дня таго далёкага
цяпер,
Шчодрага на ласку
і давер.

Падары мне светлыя
ўспаміны,
Падары шчаслівыя
хвіліны
Ночы той кароткай,
як удых,
Для вачэй і сэрцаў
маладых.

Падары мне светлыя
ўспаміны,
Падары шчаслівыя
хвіліны -
Дня зацьмення,
ночы сіняву
Падары, пакуль
яшчэ жыву.

* * *

Прыходзім мы,
звычайныя,
У свет любові
і трывог -
І будучае тайнаю
Ахутвае адразу Бог.

Пад сонцам шлях
завершыцца,
І ясным стане да канца
Жыццё тваё -
ад першага
І да апошняга вянца.

Пра ўсё душа дазнаецца,
Пра ўсё, што мучыла
ў жыцці.
Ды хто назад вяртаецца,
Каб расказаць
аб адкрыцці?

Старэем мы, звычайныя,
А прычасціць
апошні ўздых -
І самі станем тайнаю
На гэтым свеце
для жывых.

Юбілеі

Ушанавалі класіка

Творчасць пісьменніка Міхася Зарэцкага, 100-годдзе якога прыпала на лістапад гэтага года, увайшла яркай старонкай у кнігу славы айчыннай літаратуры.

Сваю літаратурную дзейнасць пачаў дваццацігадовым юнаком, за плячыма якога былі вучоба ў Аршанскім духоўным вучылішчы і Магілёўскай духоўнай семінарыі, праца вясковым настаўнікам, служба палітработнікам Чырвонай Арміі.

Яго апавяданні, аповесці, раманы, п'есы былі прасякнуты пафасам рэвалюцыйнай рамантыкі. Аўтар узнімаў складаныя маральна-этычныя праблемы, не раз уступаў у супярэчлівыя па тым часе ацэнкі падзей і з'яў сучаснасці. Славу М.Зарэцкаму прынёс востраграматычны, яркі па псіхалагічных характарыстыках, прасякнуты філасофскім роздумам раман "Сцежкі-дарожкі". У ім пісьменнік паказаў лёс народа, пакутлівыя блуканні і пошукі інтэлігенцыі ў пераломны гістарычны перыяд. У рамане "Вязьмо" праз драматычнае сутыкненне чалавечых характараў М.Зарэцкі паказаў калектывізацыю. Праз лёс паасобных герояў ён раскрыў падзеі грамадскага жыцця, стварыў псіхалагічна абгрунтаваныя, напоўненыя глыбокім сацыяльна-гістарычным зместам вобразы.

Пра гэта ішла размова на адкрытым уроку літаратуры ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў, на якім прысутнічалі вучні сярэдняй школы № 91 сталіцы, навучэнцы ліцэя БДУ, студэнты БДПУ імя М.Танка.

Перад імі выступілі член-карэспандэнт Нацыянальнай Акадэміі навук, прафесар Міхась Мушынскі, навуковы супрацоўнік дзяржаўнага музея беларускай літаратуры Міхал Пратасевіч, навуковы супрацоўнік інстытута літаратуры НАН Эма Золава, дачка М.Зарэцкага Радаміра Міхайлаўна.

На сустрэчы прысутнічалі таксама ўнукі Міхася Зарэцкага Ларыса, Міхаіл, Антон.

Яркім акордам імпрэзы стала выступленне вядомага калектыву – ансамбля "Менскі гармонік" пад кіраўніцтвам Івана Раманчука.

Ян ЗАГОРСКІ.

Берагчы непаўторнасць

З прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры

Мова - гэта не толькі тое, што аб'ядноўвае супольнасць людзей, якія жывуць на адной тэрыторыі, гэта - цэлы комплекс духоўных, філасофскіх кампанентаў, гэта - набытак сусветнай культуры. Багацце і разнастайнасць моў ствараюць непаўторную гаму суквецця ў саюзе сусветнай цывілізацыі.

Менавіта пра гэта гаварылася на прэс-канферэнцыі ў нацыянальным прэс-цэнтры, прысвечанай міжнароднаму сімпозіуму "Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі", які адбудзецца ў Мінску 8–10 ліпеня 2002 года.

Як адзначыў намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў Навум Гальпяровіч, сімпозіум пройдзе пад эгідай ЮНЕСКА. Арганізатарамі, акрамя пісьменніцкай суполкі, стануць Беларускі дзяржаўны універсітэт, Белдзяржпедуніверсітэт імя М.Танка, Інстытут мовазнаўства НАН Беларусі, Таварыства беларускай мовы і Фонд імя Льва Сапегі пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры, Міністэрства інфарматыкі і нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА.

У сімпозіуме прымуць удзел вучоныя-мовазнаўцы, дзеячы нацыянальных культур, пісьменнікі і палітыкі Беларусі, Украіны, Расіі, краін Заходняй Еўропы, прадстаўнікі ўладных структур нашай краіны.

Мэта гэтага прадстаўнічага сходу – усебакова вывучыць настаўніцкую праблему, раскрыць яе своеасаблівасць і вастрыню на фактах беларускай гісторыі, выпрацаваць рэкамендацыі па захаванні і абароне мовы і літаратуры малых народаў ва ўмовах глабалізацыі, садзейнічаць наладжванню кантактаў беларускіх пісьменнікаў, мовазнаўцаў, дзеячаў культуры са сваімі калегамі ў свеце.

Як адзначыў сустаршыня аргкамітэта і каардынатар праекта пісьменнік Васіль Якавенка, аргкамітэт правядзе цэлы каскад прамежкавых цікавых і важных "круглых сталоў", рэалізуе іншыя задумкі, якія ставяць за мэту больш глыбокае вывучэнне прадмета размовы і пошук рашэння актуальных пытанняў у сферы культурнага і духоўнага жыцця нашай краіны. Адбудзецца таксама "круглы стол" "Мова і адукацыя: падручнікі і методыкі".

Будуць наладжаны "круглыя сталы" на тэмы "Беларусь у кантэксце глабалізацыі", "Мова сродкаў масавай інфармацыі Беларусі", а таксама конкурс беларускіх студэнтаў на лепшае сачыненне па тэме "Родная мова, яе жыццяздольнасць і перспектывы развіцця", пашыранае пасяджэнне аргкамітэта на тэму "Беларускі нацыянальны універсітэт. Грамадскі клопат – дзяржаўная задача".

Старшыня нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны падкрэсліў, што ў сімпозіуме мяркуецца ўдзел генеральнага дырэктара ЮНЕСКА Кайчыра Маццуры. Выдатнай нагодай да яго прыезду можа стаць таксама і ўручэнне сертыфіката помніка сусветнай культурнай спадчыны Мірскаму замку.

Пра самыя розныя аспекты будучага міжнароднага форуму гаварылі таксама старшыня ТБМ імя Ф.Скарыны Алег Трусаў, начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Мікалай Фяськоў.

Нічыпар ЧАРНЫШ.

50 квадратных метраў жывой гісторыі,

альбо Чаму ў музеі школы №110 сярод экспанатаў ёсць недатканы пояс?

Супрацоўнікі Рэспубліканскага цэнтра турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі выказваюць спачуванне Ларысе Навумаўне Бруевай – намесніку Генеральнага дырэктара Віцебскага абласнога аб'яднання па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі, старшыні Беларускай Рэспубліканскай Асацыяцыі пошуку і ўвекавечання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў "ПОШУК" з прычыны напаткаўшага яе гора – смерці МАЦІ.

Звычайны школьны пакой. Метраў гэтак пяць-шэсць на дзесяць. Словам, плошча – недзе каля "паўсоткі".

Званок на ўрок (ці з урока – у дадзеным выпадку магчымы абодва варыянты), і гэтыя пяцьдзесят квадратных метраў напаўняюцца звонкім дзіцячым гоманам.

Тс-с-с, дзеці! Гэта – музей. Гісторыю трэба чуць, а яна зазвычай гаворыць шэптам... Э-гэ-гэй, гісторыя! Гэта – дзеці. Не шапчы, гавары грамчэй, калі хочаш тут быць пачутай!..

Тс-с-с! Гэта я ўжо сабе самому. Бо не трэба аніякіх падказак ім: ні гісторыі, ні дзецям – у школьных музеях. Тут яны і самі паразумеюцца...

А калі сур'ёзна, я ўжо даўно запрыкмеціў гэтае істотнае адрозненне музеяў школьных (пабываўшы не ў адным з іх) ад музеяў вялікіх, "афіцыйных": надта ж свойскія, панібрацкія стасункі школьнікаў і экспанатаў у першых. Быццам не з учора адбываюцца стасункі, а з сёння. Забягаючы наперад, скажу больш дакладна: з сённяшнім учора, з жывой гісторыяй.

Прычына, між іншым, – простая: частыя стасункі. Калі часта бачыш нешта, нават самую незвычайную і старажытную рэч, – прывыкаеш да яе, роднішся, дый ужо ўспрымаеш гэта як сваё, тутэйшае – у часавым вымярэнні. А калі яшчэ можаш памацаць гэтую рэч (балазе, у школах я нідзе не бачыў шыльдачак "Рукамі не чапаць"), дык сціраецца адлегласць не толькі часавая, але і "экзістэнцыяльная": "там-быццё" становіцца "тут-быццём" у рэальны момант судакранання. Аперазаўшыся, скажам, поясам, сатканым на пачатку стагоддзя, апынешся целам тут, духам – там. Але ж пояс гэтаксама будзе і там, і тут, гэтаксама маючы "дух" (уласную гісторыю) і "цела" (тканіну).

Музей у сталічнай сярэдняй школе №110 сам па сабе мае досыць доўгую гісторыю. Створаны ў 1982 годзе як музей народнай славы, ён адразу ж стаў "месцам сустрэчы" і дыялогу школьнікаў і Гісторыі з вялікай літары. Шматлікія пошукавыя экспедыцыі, актыўны ўдзел дзяцей у розных гісторыка-краязнаўчых віктарынах і конкурсах, вандроўкі па знакамітых мясцінах – вынікі ўсёй гэтай дзейнасці, "матэрыялізаваныя" ў экспанатах, знаходзілі свой надзейны прытулак на пяцідзесяці квадратных метрах у пакоі музея на трэцім паверсе школы.

Тым часам сама Гісторыя са спакойнай, ураўнаважанай гутаркі часцяком збівалася на "скорагаворку": застойныя рэаліі з усімі сваімі атрыбутамі, у тым ліку школьнага жыцця, змяніліся на перабудовачныя, перабудовачныя – на постсавецкія, постсавецкія пераўтварыліся ўжо ў зусім стракатую і, бадай што, няўлоўную "карцінку" (да слова, менавіта ў 110-й сярэдняй школе была зарэгістравана першая ў Кастрычніцкім раёне сталіцы адноўленая піянерская арганізацыя). Гісторыя ж школьнага музея, у сваю чаргу, на якісьці момант нібы запаволілася, стаілася і замерла... Аж пакуль не знайшлі адна адну яны: пачынальніца музея народнай славы, настаўніца гісторыі і геаграфіі Галіна Анатольеўна Гарбацэвіч, якая працуе ў 110-й ужо трыццаць гадоў, і галоўная натхняльніца музея сённяшняга – "перакваліфікаванага" ў сувязі з рэспубліканскай экспедыцыяй "Наш край" у этнаграфічны – настаўніца беларускай мовы і літаратуры Ганна Сяргееўна Сасноўская, якая прыйшла ў 110-ю працаваць нядаўна.

Сёння этнаграфічны музей 110-й мінскай сярэдняй школы – відавочны прыклад таго, наколькі жывая гісторыя можа быць чуйнай да жывых, ініцыятыўных людзей: Галіны Анатольеўны і Ганны Сяргееўны, галоўнага апекуна музея, дырэктара школы Генадзя Іванавіча Герасімовіча, "музычнага афармляльніка" музея, настаўніцы музыкі Галіны Аляксандраўны Лашкевіч, маленькіх экскурсаводаў і наогул да ўсіх вучняў школы, што ўжо навучыліся быць на "ты" з экспанатамі...

Дык жа – увойдзем.

Сур'ёзна, пранікнёна і, як заўжды, крыху скрушна глядзіць на нас са сцяны Янка Купала. 2002 год, які ўжо афіцыйна абвешчаны "ягоным", тут пачаўся даўно. Бо менавіта "пад эгідай" 120-годдзя нашага нацыянальнага генія, як паведаміла мне Ганна Сяргееўна Сасноўская, праведзены ўжо і будуць праводзіцца шматлікія культурніцкія мерапрыемствы. Вучні школы пабывалі ўжо на дзвюх цікавых тэматычных "купалаўскіх" сустрэчах у Доме дружбы: "літоўскай" (Янка Купала – Саламея Нерыс) і "латышскай" (Янка Купала – Яніс Райніс).

Пасярэдзіне – доўгая драўляная стальніца. На ёй – альбомы з летапісам музея; каштоўныя падарункі, звычайна – кніжкі, падараваныя шаноўнымі наведвальнікамі; даследчыя працы вучняў на розныя гісторыка-краязнаўчыя тэмы. Паказальна, дарэчы, што ў экспедыцыю "Наш край" актыўна ўключыліся вучні не толькі гуманітарных профіляў. Напрыклад, "геаграфы" ўсур'ёз заняліся біяграфіяй і навуковай спадчынай нашага славутага земляка, геолага, даследчыка Чылі Ігната Дамейкі; "фізікі" захапіліся жыццём і дзейнасцю іншага беларуса па паходжанні, даследчыка сонечнай сістэмы Аляксандра Чыжэўскага...

Нарэшце, уздоўж сцяны па перыметры прадстаўлена ўласна этнаграфія: ручнікі, дываны, дарожкі, шматлікія гаспадарчыя прылады – усе з розных часоў і куточкаў нашай Бацькаўшчыны. Для кожнай рэчы распрацаваны асобны тэкст: з вуснаў дванаццаці-трынаццацігадовых экскурсаводаў тут можна пачуць цэлую лекцыю пра складаную сімволіку беларускага арнаменту або пра асаблівасці традыцыйных народных рамёстваў...

А, бадай што, на самым бачным месцы вісіць... недатканы пояс. І подпіс: "Пояс незакончаны. Веска Хутар Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці".

На мой здзіўлены погляд, Ганна Сяргееўна адказвае, што так і павінна быць па задуме: каб дзеці маглі наглядна ўбачыць і зразумець усю "тэхналогію" вырабу паясоў.

Словам, гэтакі разрэз гісторыі – у простым і пераносным сэнсах. Бязбольная аперацыя на жывой гісторыі. Але ж праўда: бездапаможна павіслыя ніткі не баяцца тут маленькіх "хірургаў".

Мікола ЧЭМЕР.

НА ЗДЫМКАХ: кіраўнік музея Ганна Сяргееўна Сасноўская з дзецьмі; экспанаты музея; вучні 4"А" класа Алеся Суглоба і Ян Магілёўчык падчас працы ў музеі.

Фота Юрыя БОНДАРАВА.

Галоўны рэдактар Аляксандр Гайдук

ЗАСНАВАЛЬНІК — МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Рэгістрацыйны нумар 197.

НАШ АДРАС:
220034, МІНСК, ВУЛІЦА ЗАХАРАВА, 42.
Тэлефоны прыёмнай рэдакцыі: 36-91-42; намеснікаў галоўнага рэдактара — 36-40-63; бухгалтэрыі — 36-53-22; рэкламы — 36-53-22; аддзелаў: школ — 36-43-62; праблем выхавання, навукі — 36-43-71, 36-90-63; інфармацыі — 36-43-71; ВНУ і тэхнікумаў — 36-44-25; прафтэхадукацыі, пісьмаў і сацыяльных праблем — 36-44-25; культуры — 36-41-55.
ФАКС: 36-53-22.

Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць свае прозвішча поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт), асноўнае месца работы, зваротны адрас, нясуць адказнасць за дакладнасць фактаў і іншай інфармацыі.

Пісьмы, рукапісы, фотаздымкі і малюнкі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Аб'явы могуць друкавацца не толькі на дзяржаўнай, але і на замежных мовах.

Меркаванне аўтараў публікацый не абавязкова адлюстроўвае пункт гледжання рэдакцыі.

Адказны дзяжурны Ала ШАЎЦОВА.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку»", 220013, Мінск, праспект Ф.Скарыны, 79.
Аб'ём — два друкаваныя аркушы. Спосаб друку — афсетны. Фармат А2. Індэкс 63867.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12. Замова № 7295
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Падпісана да друку 12.12.2001 г. у 18.10
Наклад 30.000 паасобнікаў.